WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

12 КАСТРЫЧНІКА 2010 г.
АЎТОРАК
№ 199
(26807)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

**Прамая лінія**

## Дапамогі, пенсіі, паслугі

**Адрасная сацыяльная дапамога і варыянты сацыяльных паслуг, асаблівасці вылічэння стажу і індывідуальнага каэфіцыента, пенсійныя надбаўкі і павышэнні — усё гэта стане тэмай «прамой лініі» нашай газеты з удзелам намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Валянціны Вікенцьеўны Каралёвай.**

Такім чынам, увага! Паводле папярэдняй дамоўленасці, «прамая лінія» будзе праходзіць **з 11 да 12 гадзін 13 кастрычніка** па рэдакцыйных тэлефонах: **(8 017) 292 38 92 і 232 38 21**. Нумар для папярэдніх пытанняў — **287 17 57**.

# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА І ХУ ЦЗІНЬТАА АБМЕРКАВАЛІ БЯГУЧЫ СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ СУПРАЦОЎНІЦТВА ПАМІЖ ДЗВЮМА КРАІНАМІ



Фота БЕЛТА.

**ПРЭЗІДЭНТ Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка і Старшыня Кітайскай Народнай Рэспублікі Ху Цзіньтаа 11 кастрычніка абмеркавалі ў Пекіне бягучы стан і перспектывы развіцця супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі, а таксама абмяняліся думкамі па актуальных пытаннях сусветнага парадку дня. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Ху Цзіньтаа за добры і цёплы прыём, «за вялікую дапамогу і падтрымку». Прэзідэнт Беларусі падзяліўся сваімі ўражаннямі ад цяперашняга наведвання Кітая і Сусветнай выстаўкі «ЭКСПА-2010» у Шанхаі. «Мы чарговы раз уражаны тымі маштабамі, тымі ўнікальнымі праектамі, якія вы ствараеце. Вы дэманструеце ўсяму свету дынамізм». Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэта яго шосты візіт у Кітай. «На маіх вачах адбыліся асноўныя падзеі, якія вывелі вас у лідары сусветных дзяржаў», — сказаў ён. Кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што ў Беларусі радуюцца ўсім поспехам Кітая: «Мы ставімся да вашых поспехаў, як да сваіх уласных».

Старшыня КНР адзначыў, што яму вельмі прыемна праз два гады зноў сустрэцца з Прэзідэнтам Беларусі. Ху Цзіньтаа падзякаваў Аляксандру Лукашэнку і ўсяму беларускаму народу ад імя ўрада і кітайскага народа за дапамогу ў пераадоленні наступстваў стыхійных бедстваў.

Вечарам быў дадзены абед у гонар Прэзідэнта Беларусі ад імя Старшыні КНР Ху Цзіньтаа.

У ходзе візіту кіраўніка беларускай дзяржавы ў Кітай у 2005 годзе краіны заявілі аб выхадзе на ўзровень стратэгічнага партнёрства, што было замацавана ў сумеснай дэкларацыі. У жніўні 2008 года Аляксандр Лукашэнка, сустракаючыся са Старшынёй КНР, заклікаў Кітай ажыццявіць «вялікі прыход у Беларусь». Гэта стратэгія пачала актыўна рэалізоўвацца, і ў сакавіку 2010 года ў час візіту ў Беларусь намесніка Старшыні КНР Сі Цзіньпіна быў заключаны шэраг важных пагадненняў, якія далі магчымасць пачаць прапрацоўку буйных праектаў у крэдытна-інвестыцыйнай сферы. Агульная сума крэдытнай лініі, якая прадастаўляецца Беларусі, — $15 млрд ($1 млрд — ільготны крэдыт).

Тавараабарот паміж дзвюма краінамі па выніках 2009 года склаў больш як $1 млрд 255 млн. За сем месяцаў 2010 года — амаль $1 млрд 68 млн, што складае 160,1 працэнта да аналагічнага перыяду мінулага года.

І цяпер на перагаворах абмяркоўваліся планы па нарошчванні супрацоўніцтва дзвюх дзяржаў у гандлёва-эканамічнай сферы. Аляксандр Лукашэнка заклікае кітайскіх партнёраў хутчэй і ў большым аб'ёме ісці ў Беларусь. Паводле яго слоў, гэтыя перагаворы павінны «вызначыць стратэгію супрацоўніцтва дзвюх краін на гады наперад».

Акрамя таго, 11 кастрычніка Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у цырымоніі адкрыцця зборачнай вытворчасці і сэрвіснага цэнтра сумеснага прадпрыемства ТАА «АВІК-БелАЗ Кар'ерныя машыны».

Заснавальнікамі СП выступілі ААТ «БелАЗ» і кітайская карпарацыя «КАЦІК Сэплай», якая ўваходзіць у склад Кітайскай карпарацыі авіяцыйнай прамысловасці. СП зарэгістравана ў верасні 2009 года, 1 кастрычніка 2010 года ў Пекіне было завершана будаўніцтва офісных і вытворчых памяшканняў кампаніі. Са студзеня 2010 года СП пачало рэалізацыю кар'ернай тэхнікі на рынку КНР у якасці эксклюзіўнага дылера ААТ «БелАЗ». За дзевяць месяцаў 2010 года сумеснае прадпрыемства выйграла шэсць тэндараў на агульную суму паставак $35,9 млн. Як адзначыў Прэзідэнт Беларусі, адкрыццё сумеснага прадпрыемства можна лічыць чарговай вяхой плённага супрацоўніцтва Беларусі і Кітая. «БелАЗ» — гордасць беларускага машынабудавання. Гэта брэнд, вядомы ва ўсім свеце. Наша кар'ерная тэхніка цудоўна зарэкамендавала сябе ў многіх краінах, у Кітаі добра вядома яшчэ з 60-х гадоў мінулага стагоддзя».

Беларусь ужо амаль 15 гадоў па пытаннях паставак сваёй тэхнікі працуе з карпарацыяй «КАЦІК Сэплай». «Яшчэ пяць месяцаў таму на гэтым месцы быў пусты ўчастак, а сёння мы адкрываем тут новае перспектыўнае прадпрыемства. Такая хуткасць работы сапраўды ўражвае! — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Можна сказаць, узяты добры старт. А добры пачатак — гэта гарантыя поспеху».

Прэзідэнт асобна звярнуўся да кіраўнікоў сумеснага прадпрыемства, адзначыўшы, што ў хуткім часе трэба будзе пастаўляць прадукцыю не толькі ў Кітай. На яго думку, ёсць усё неабходнае, каб заваяваць сваю нішу на новых рынках, у іншых краінах Азіі. Перш за ўсё, гэта сучасныя тэхналогіі, высокакваліфікаваны персанал і напрацаваныя сувязі з партнёрамі. Перад СП стаяць сур'ёзныя задачы па павелічэнні долі кар'ерных самазвалаў БелАЗ на рынку КНР да 25 працэнтаў, павышэнні тэхналагічнага ўзроўню тэхнікі, павелічэнні долі мясцовых дэталяў і камплектуючых, зніжэнні сабекошту прадукцыі. Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з тым, як наладжана зборачная вытворчасць і абслугоўванне тэхнікі, пабываў у рамонтнай зоне і зборачным цэху.

Таксама кіраўнік беларускай дзяржавы правёў сустрэчу з генеральным дырэктарам Кітайскай карпарацыі авіяцыйнай прамысловасці Лінь Цзамінам. Прэзідэнт прапанаваў карпарацыі рэалізацыю праектаў у Беларусі. «Беларусь і Кітай — гэта сёння надзейныя і эфектыўныя партнёры. 20 гадоў таму мы не памыліліся, выбраўшы Кітай галоўным партнёрам для супрацоўніцтва. Зразумела, такая гіганцкая краіна з такой гіганцкай эканомікай не можа не быць зацікаўлена ў пашырэнні сваіх інтарэсаў у Еўропе. Калі вы ідзяце ў Еўропу, то прыходзьце ў цэнтр Еўропы. Мы будзем вам актыўна дапамагаць і падтрымліваць у Беларусі», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Кітайскай карпарацыі авіяцыйнай прамысловасці ёсць магчымасць выхаду на вялікі рынак постсавецкіх дзяржаў. «У нас унікальнае становішча ў Мытным саюзе.

СТАР. 2



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## АЖЫЎЛЕНАЕ СКРЫЖАВАННЕ

**Завочная прамая лінія**

### КАЛІ ВЫБІЛІСЯ З РАЎНАВАГІ...

Што ёсць неўроз, якія псіхатропныя прэпараты здольныя выклікаць залежнасць — на гэтыя і іншыя пытанні адкажа **загадчык амбулаторнага аддзялення памежных станаў № 1, урач-псіхатэрапеўт Мінскага гарадскога цэнтра памежных станаў Вольга Генадзьеўна ПРАКОПЬЕВА**.

Пытанні можна пакінуць па нумары рэдакцыі: **8 (029) 287 18 29 да 15 кастрычніка**. Адказы будуць надрукаваныя ў газеце.

**Перaймай!**

### САЦЫЯЛЬНЫЯ ЗНІЖКІ ЖЫХАРАМ ВІЦЕБСКА

**Сацыяльны праект прадастаўлення зніжак на тавары і паслугі пачынае дзейнічаць у Віцебску. Мінімальная зніжка — тры працэнты, максімальная — 20.**

— Праект прысвечаны Году якасці, які праходзіць у Беларусі, — расказвае «Звяздзе» Андрэй Лапін, дырэктар па развіцці гарадскога інтэрнэт-партала www.gorod.vitebsk.by.

Ужо больш за 20 арганізацый пажадалі ўдзельнічаць у акцыі. Сярод іх — школа танцаў, аўташколы, кавярні і рэстараны (у тым ліку і знакаміты гатэль «Эрыдан», дзе любяць спыняцца «зорныя» госці), капіравальныя цэнтры, турыстычныя фірмы, станцыі па тэхнічным абслугоўванні аўтамабіляў... Зручнасць для ўладальніка сацыяльнай карткі ў тым, што яму не трэба нічога купляць, каб набыць яе, і з адной карткай ён можа атрымаць цэлы спектр паслуг.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### АСЦЯРОЖНА, КРЭДЫТНЫЯ МАХЛЯРЫ!

**Адразу дзве крымінальныя справы па махлярстве распачатыя апошнімі днямі ў Ленінскім раёне горада Магілёва, паведамілі ў Магілёўскім абласным УУС. Справы падобныя і звязаныя з набыццём дарагіх рэчаў за крэдытныя сродкі.**

У адным выпадку 27-гадовы магіляўчанін падманным шляхам пераканаў 36-гадовую гараджанку аформіць крэдыт на набыццё камп'ютара, кошт якога перавышаў 1 мільён 400 тысяч рублёў. Затым мужчына забраў камп'ютар і прадаў яго.

У другой справе 24-гадовая магіляўчанка пераканала 43-гадовую жанчыну аформіць крэдытную дамову на набыццё халадзільніка, які каштаваў 1 мільён 870 тысяч рублёў. Пасля афармлення здзелкі халадзільнік быў прададзены.

Грошы ж за тавар у абодвух выпадках сталі лагічна спаганяць з асобаў, якія афіцыйна аформілі крэдыты. Выявілася, што людзі, якія пераконвалі даверлівых грамадзян афармляць набыццё тэхнікі ў крэдыт, ужо былі асуджаныя за аналагічныя злачынствы.

**Алена КАЗЛОВА.**

### ЧАЛАВЕК ЗАГІНУЎ У ТРАНШЭІ

**Пракуратура горада Полацка і Полацкага раёна расследуе факт гібелі чалавека, які быў завалены грунтам у траншэі.**

Як паведаміла «Звяздзе» Марына Фандо, прэс-сакратар Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях, трагедыя адбылася ў вёсцы Тросна. На тэрыторыі прыватнай сядзібы два мужчыны капалі каналізацыйную траншэю глыбінёй 1,5 метра. Калі гаспадар на нейкі час спыніў працу, яго таварыш працягваў капаць. Грунт раптам пасыпаўся. Мужчына, якому было 32 гады, быў завалены зямлёй. Выратавальнікі дасталі цела, на жаль, ужо нежывога чалавека.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ДАМІНІКАНЦЫ І ДАМЕНІКАНЫ

**У 1586 г. Нясвіж атрымаў магдэбургскае права і стаў буйным па тым часе эканамічным, палітычным і рэлігійным цэнтрам. Тут узводзіцца езуіцкі калегіум, і амаль у гэты ж час (1590-1595 гг.), будуецца кляштар бенядыкцінак, а праз тры гады закладзены кляштар бернардзінцаў. Манахі-дамініканцы аселі ў Нясвіжы значна пазней — у 1672 годзе, і яны нас цікавяць найперш.**

### ДАМІНІКАНЦЫ

Калі ў XII стагоддзі ў Францыі ўзнік рух альбігойцаў, у якім у асноўным удзельнічала бедната (рамеснікі і сяляне), то перад каталіцкай царквою паўстала праблема. Справа ў тым, што альбігойцы не прызнавалі ўлады папы, супрацьпастаўлялі матэрыяльнаму свету (зямному) — свет духоўны (Божы), не верылі ў пекла...

Вось тут і ўзнікла ў Ватыкана неабходнасць стварэння манаскага ордэна, які змог бы даць адпор альбігойцам. А гэта было нялёгка, бо неабходна было мець справу з ніжэйшымі слаямі насельніцтва. І вось на пачатку XIII стагоддзя манах Дамінік заснаваў ордэн, які павінен быў абараняць інтарэсы святога прастола.

Асаблівасцю Дамініканскага ордэна было тое, што ён быў жабрацкім. Манахі павінны былі жыць за кошт міласціны, здабываць сабе кавалак хлеба, але ім забаранялася мець уласнасць. Дарэчы, такі статут мелі і некаторыя іншыя ордэны.

Да XVI ст. дамініканцы былі магутным ордэнам, а калі з'явіліся езуіты, то дамініканцы адышлі на другі план, згубілі былую моц і пачалі займацца найперш місіянерствам і асветніцтвам.

У Нясвіжы пры дамініканскім кляштары працавала школа, у якой вучыўся беларускі паэт Уладзіслаў Сыракомля. Напомню, што ў дамініканскай школе, але ў Навагрудку, вучыўся і наш зямляк — паэт Адам Міцкевіч.

Але Вялікае Княства прыйшло ў заняпад, а потым дайшла чарга і да Рэчы Паспалітай — Польшчу падзялілі. І на беларускую зямлю прыйшоў царскі парадак.

Усе кляштары ў Нясвіжы былі зачыненыя, і гэта нягледзячы на тое, што большасць іх дзейнічала там амаль 300 гадоў. У 1872 годзе ліквідавалі і кляштар дамініканцаў.

Большасць дамініканцаў разам з манахамі іншых кляштараў падалася на Захад, а меншасць асела ў наваколлі Нясвіжа. Магчыма, ім надакучыла манаскае жыццё, а можа, нехта не хацеў ісці на чужыну, вось дамініканцы і ажаніліся з мясцовымі дзяўчатамі — сталі звычайнымі сялянамі. Відавочна, тут адыграла сваю ролю і тое, што для дамініканцаў каса і плуг (саха) былі звыклымі рэчамі.

### ДАМЕНІКАНЫ

У в. Грускова, якая знаходзіцца каля Снова, а гэта ў 15 км ад Нясвіжа, Дамeніканы — самае распаўсюджанае прозвішча. Хоць яго можна сустрэць і ў іншых мясцінах, але карані іх у Грускова.

Сёння ўсе Даменіканы лічацца праваслаўнымі, але ж манахі былі каталікамі і імёны яны мелі адпаведныя.

На мясцовых могілках некалькі гадоў таму я знайшоў на магіле сціплы помнік з каменю, на якім было выбіта «Францъ Даменіканъ». Здаецца (цяжка разабраць), ён пражыў 98 гадоў. А зусім нечакана падчас размовы са знаёмым, чыё прозвішча таксама Даменікан, даведаўся, што пад тым каменем ляжыць яго прадзед. Праўнукі Франца Даменікана нарадзіліся перад апошняй вайной і падчас яе, і не трэба было доўга вылічваць, каб устанавіць, калі прыйшоў у Грускава манах Франц. А пазней высветлілася, што сярод Даменіканаў быў і Казімір. У ордэне манахі прозвішчаў не мелі: быў брат Франц, брат Казімір, брат Ян, брат Міхал...



Некалі сяляне атрымлівалі прозвішчы, як правіла, па мянушках, якія ў вёсках мела кожная сям'я. Вось і з'явіліся прозвішчы: Жук, Муха, Буза..., а былых манахаў усе ведалі як Даменіканаў.

Я прыехаў у Грускова, каб сустрэцца з праўнукам Франца. Спыніўся каля крамы і спытаў у жанчыны, як праехаць да Ільі Даменікана. Кабета растлумачыла і дадала: «Вы яго хату адразу пазнаеце — гаспадар».

Цагляны дом, сапраўды, у парадку, на дворыку кветкі, а на сцяне дома — спадарожнікавая антэна. Прывабны і інтэр'ер — хораша і ўтульна. Разгаварыліся. Гаспадыня Надзея Кузьмінічна аказалася, як і яе муж, даволі камунікабельным чалавекам.

— У нас Даменіканаў многа, але мы не радня, проста маем адно прозвішча.

СТАР. 3



## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У АРХАНГЕЛЬСКУ ЗЛАВІЛІ ХАБАРНІКА-РЭКАРДСМЕНА

**У Архангельску следчымі органамі прад'яўлена абвінавачванне рэктару Паўночнага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Паўлу Сідараву ў прыёме аж 197 хабараў на агульную суму ў шэсць мільёнаў рублёў.**

У рэктара было восем «давераных асоб», праз якіх ён і прымаў дары — за паступленне ва ўніверсітэт, за рамонт аўдыторый, за прыём на працу і г.д. Некалькі папярэдніх месяцаў Сідараў знаходзіўся ў бальніцы, таму і крымінальная справа ў яго стаўленні нібыта «завісла». Але пракурорскія адлавілі Сідарава, калі той літаральна на суткі выйшаў са здраўніцы, каб «перапрапісацца» ў іншай лячэбнай установе.

### ШВАРЦЭНЕГЕР ПРАКАЦІЎСЯ НА МАСКОЎСКІМ МЕТРО

**Губернатар Каліфорніі і вядомы галівудскі акцёр Арнольд Шварцэнегер, які знаходзіцца ў Маскве з візітам, спусціўся ў сталічную падземку і пракаціўся на цягніку метро.**

Экскурсію па падземцы «тэрмінатар» праводзіў у суправаджэнні паслоў ЗША і Аўстрыі. Заўважыўшы ўсмешкі на тварах масквічоў, каліфарнійскі губернатар выказаў здагадку, што жыхары сталіцы «любяць свой грамадскі транспарт». Пасажыры, якія стоўпіліся вакол вядомага госця, спрабавалі сфатаграфаваць яго. Учора Шварцэнегер планаваў сустрэцца з прэзідэнтам Расіі Дзмітрыем Мядзведзевым. Разам яны збіраліся наведаць аналаг амерыканскай Сіліконавай даліны — расійскі інавацыйны цэнтр «Сколкава».

### ЖОНКА ПРЭЗІДЭНТА ПОЛЬШЧЫ ПАЛЯЦЕЛА ДАДОМУ З ТРЭЦЯЙ СПРОБЫ

**Польская дэлегацыя на чале з жонкай прэзідэнта Ганнай Камароўскай, якая прымала ўдзел у памятных мерапрыемствах пад Смаленскам, змагла вярнуцца ў Варшаву толькі з трэцяга разу.**

Дэлегацыя прыбыла ў Расію 10 кастрычніка. Два самалёты са сваякамі загінулых у выніку красавіцкага крушэння прэзідэнцкага Ту-154 прыляцелі з Варшавы ў Віцебск, адкуль члены дэлегацыі на аўтобусах даехалі да Смаленска. Планавалася, што ў той жа дзень яны вернуцца ў Польшчу: самалёты павінны былі вылецець назад з Віцебска, аднак на адным з «Боінгаў» выявіліся непаладкі ў рухавіку. Неўзабаве для іх быў высланы запасны самалёт, аднак і на ім выявілася няспраўнасць. У выніку жонка прэзідэнта і людзі, якія яе суправаджалі, правялі ноч у Беларусі, пасля чаго за імі выслалі два ўрадавыя Embraer. Раніцай 11 кастрычніка дэлегацыя пакінула Віцебск і прызямлілася ў Варшаве.

### УКРАІНЕ ПРАПАНАВАЛІ РАЗМАЎЛЯЦЬ НА ТРОХ МОВАХ

**Ва Украіне могуць увесці тры афіцыйныя мовы: украінскую, рускую і англійскую.**

«Я б прапанавала такі некалькі нетрадыцыйны спосаб рашэння гэтай праблемы: зрабіць ва Украіне тры афіцыйныя мовы — украінскую, рускую і англійскую», — расказала намеснік кіраўніка адміністрацыі прэзідэнта Украіны Ганна Герман у інтэрв'ю аднаму з тэлеканалаў. Паводле яе слоў, гэтае нававядзенне дасць краіне цэлы шэраг пераваг. Так, англійская мова дазволіла б Украіне зрабіць «прарыў у свет». «Зробім ва-Украіне тры афіцыйныя мовы. І вы ўбачыце, як шмат моладзі будзе мець матывацыю вучыць больш сусветных моў», — падкрэсліла яна.

### СУПЕРНІКІ ГЕЙ-ПАРАДУ ЎЧЫНІЛІ БЕСПАРАДКІ

**Падчас гей-параду ў Бялградзе адбыліся масавыя беспарадкі з удзелам сотняў супернікаў шэсця. У выніку сутыкненняў пацярпела каля 90 чалавек, галоўным чынам паліцэйскія.**



Удзельнікі беспарадкаў рабілі падпалы, закідвалі каменнем офісы, рабавалі крамы. Яны спрабавалі прарвацца да парламента, але былі спыненыя паліцыяй. Супернікі гей-параду закідвалі паліцэйскіх каменнем і бутэлькамі з гаручай сумессю. Паліцыя ў адказ выкарыстала слязісты газ. Затрымана каля сотні чалавек. У гей-парадзе, які стаў другім у гісторыі Сербіі, прынялі ўдзел каля тысячы чалавек.

### ПРЫВАТНЫ КАСМАЛЁТ ЗДЗЕЙСНІЎ ПЕРШЫ ПАЛЁТ

**Касмічны карабель для турыстаў здзейсніў свой першы палёт.**

Падчас выпрабаванняў самалёт-носьбіт вывеў SpaceShipTwo на вышыню больш за 13 тысяч метраў, пасля чаго касмічнае судна адстыкавалася і



самастойна праляцела каля 11 хвілін пры выключаных рухавіках. Выхад карабля на касмічную арбіту па плане адклалі да наступнага выпрабавання. Палёты распісаныя на некалькі гадоў наперад: 370 будучых астранаўтаў ужо заплацілі кампаніі каля 50 мільёнаў долараў. Адно месца ў SpaceShipTwo абыдзецца кожнаму турысту ў 200 тысяч долараў.

ЗАКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
Цептер Банк

ЗАО «ЦЕПТЕР БАНК»
Адрес: 220034, г. Минск, ул. Платонова, 1Б
эл. адрес: info@zepterbank.by.
Тел. 331 89 49, факс 331 89 48

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2010 г.
ЗАО «Цептер Банк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2010 | 01.10.2009 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 1 498,0 | 1 554,9 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 2 417,0 | 811,4 |
| 4 | Ценные бумаги: | 1103 | 18 049,9 | 9 261,5 |
| | для торговли | 11031 | 16 543,4 | 1 106,2 |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | – | – |
| | в наличии для продажи | 11033 | 1 506,5 | 8 155,3 |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 9 030,1 | 37 278,5 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 66 262,6 | 16 704,5 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | – | – |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 8 683,6 | 1 338,2 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 2 376,1 | 1 104,1 |
| 10 | ИТОГО активы | 110 | 108 317,3 | 68 053,1 |
| 11 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | – | – |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 7 575,4 | 4 561,2 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 27 875,2 | 14 299,0 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | 18 622,2 | 3 236,6 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 939,6 | 1 236,5 |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | 55 012,4 | 23 333,3 |
| 18 | КАПИТАЛ | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 42 030,0 | 36 000,0 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | – | – |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | 2 101,5 | 131,8 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 9 136,4 | 8 590,4 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 37,0 | (-2,4) |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | 53 304,9 | 44 719,8 |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 108 317,3 | 68 053,1 |
| 26 | ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 59 973,6 | 7 610,9 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 14 376,6 | 2 249,4 |

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ с 1 января 2010 г. по 30 сентября 2010 г.
ЗАО «Цептер Банк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.01.2010-30.09.2010 | 01.01.2009-30.09.2009 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 9 005,4 | 4 248,8 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 1 663,4 | 520,4 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 7 342,0 | 3 728,4 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 834,0 | 151,9 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 124,1 | 45,4 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 709,9 | 106,5 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 959,0 | 10 133,5 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 12,2 | 48,7 |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | – | – |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 421,0 | 201,2 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 90,4 | – |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 5 851,4 | 3 829,3 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 431,9 | 105,8 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | 329,1 | 2 018,1 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 2 080,1 | 7 862,7 |

Председатель Правления Дворников Игорь Андреевич

Главный бухгалтер Нестерова Галина Чеславовна

Лицензия Национального банка Республики Беларусь от 13 ноября 2008 года № 31 на осуществление банковской деятельности. УНП 807000214 БИК 153001820

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.10.2010 г. (для б/н разлікаў)

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША | 2 993,00 | 1 чэшская крона | 170,10 |
| ▼ 1 еўра | 4 170,75 | 1 польскі злоты | 1047,80 |
| 1 латвійскі лат | 5 877,27 | ▲ 1 расійскі рубель | 100,33 |
| 1 літоўскі літ | 1 206,78 | 1 украінская грыўня | 376,86 |

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 29,8317 |
| 10 UAH | 37,5549 |
| 1000 BYR | 9,9638 |
| EUR | 41,6600 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

ISSN 1990 - 763X

# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА І ХУ ЦЗІНЬТАА АБМЕРКАВАЛІ БЯГУЧЫ СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ СУПРАЦОЎНІЦТВА ПАМІЖ ДЗВЮМА КРАІНАМІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Гэта павялічвае магчымасці для супрацоўніцтва, узмацнення гэтага супрацоўніцтва. Вы зможаце бяспошлінна гандляваць фактычна на ўсёй тэрыторыі постсавецкай прасторы», — сказаў беларускі лідар.

У сваю чаргу, Лінь Цзамін пацвердзіў гатоўнасць супрацоўніцтва з Беларуссю. «Мы гатовы інвесціраваць у праекты ў Беларусі, — сказаў ён. — Думаю, наша супрацоўніцтва будзе садзейнічаць умацаванню адносін паміж нашымі краінамі».

Кітайская карпарацыя авіяцыйнай прамысловасці (АВІК) з'яўляецца адной з буйнейшых дзяржаўных кітайскіх карпарацый цэнтральнага падпарадкавання. У яе склад уваходзіць каля 200 даччыных кампаній, прадпрыемстваў і філіялаў, 21 з якіх выйшлі на кітайскія біржы.

У Пекіне 11 кастрычніка таксама адбылося падпісанне шэрагу двухбаковых дакументаў з удзелам членаў афіцыйнай дэлегацыі, якія суправаджалі Прэзідэнта Беларусі ў ходзе яго рабочага візіту ў КНР. Беларусь і Кітай падпісалі пакет дакументаў па рэалізацыі сумесных праектаў на $3,5 млрд.

Урад Беларусі і Эксімбанк КНР падпісалі рамачнае пагадненне аб фінансаванні прыярытэтных інвестыцыйных праектаў. З Эксімбанкам заключаны крэдытныя пагадненні па фінансаванні праектаў па стварэнні інтэлектуальнай транспартнай сістэмы Мінска, электрыфікацыі ўчасткаў чыгункі ў Гомельскай і Магілёўскай абласцях, а таксама па фінансаванні паставак грузавых электравозаў.

Міністэрства эканомікі Беларусі і Кітайская карпарацыя інжынірынгу САМС падпісалі пагадненне аб стварэнні ў Беларусі кітайска-беларускага індустрыяльнага парку.

З дапамогай кітайскіх інвестыцый будзе пабудаваны завод па вытворчасці сульфатнай беленай цэлюлозы на базе ААТ «Светлагорскі ЦКК» магутнасцю 400 тыс. тон у год, завод індустрыяльнага домабудавання магутнасцю 200 тыс. кв.м і завод кальцыніраванай соды. Будуць пабудаваны таксама дзве новыя электрастанцыі: ПГУ-400 МВт Бярозаўскай ДРЭС і ПГУ-400 МВт Лукомскай ДРЭС. Прычым будаўніцтва новай электрастанцыі на Бярозаўскай ДРЭС пачнецца ўжо ў снежні гэтага года, завяршыць яго плануецца за тры гады. Кошт праекта ацэньваецца ў памеры $400 млн.

Заключаны таксама інвестыцыйны дагавор з ТАА «Пекін Юні — Канстракшн Груп» аб рэалізацыі праекта па будаўніцтве ў Мінску гасцінічнага комплексу «Пекін» з аб'ектамі абслугоўвання.

Кітайскі бок прафінансуе праект па рэканструкцыі дзеючага аэравакзальнага комплексу Нацыянальнага аэрапорта Мінск. Тут плануецца стварыць сучасны міжнародны пасажырскі тэрмінал, абсталяваць аэрапорт сістэмамі бяспекі і апавяшчэння, а таксама пабудаваць другую штучную ўзлётна-пасадачную паласу з магчымасцю прыёму самалёта А-380. Арыенціровачна кошт праекта складзе каля $600 млн.

Як адзначыў першы віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Сямашка, гэтыя праекты вельмі значныя для эканомікі Беларусі. «Мы спадзяёмся, што з іх дапамогай зможам дагнаць Кітай, які развіваецца з прыростам ВУП 11 працэнтаў. Дагнаць у іншым маштабе, але з добрым тэмпам росту эканомікі», — дадаў ён. Гэтыя праекты выгадныя як Беларусі, так і кітайскаму боку: Беларусі гэта дасць магчымасць паскорыць дынаміку развіцця, а Кітаю — асвоіць еўрапейскі рынак і даказаць слушнасць на еўрапейскім кантыненце. Уладзімір Сямашка таксама адзначыў, што сёння закладзена аснова для асваення і шэрагу іншых праектаў з Кітаем на $15 млрд, дамоўленасць аб чым была дасягнута ў пачатку гэтага года. Цяпер на розных стадыях падрыхтоўкі знаходзіцца каля 100 праектаў.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў ходзе рабочага візіту ў Кітай 10 кастрычніка наведаў Сусветную выстаўку «ЭКСПА-2010» у Шанхаі. Кіраўнік дзяржавы пабываў у нацыянальных павільёнах Беларусі і Кітая.

Наведваючы Нацыянальную экспазіцыю Кітая, Прэзідэнт прыняў удзел ва ўрачыстай цырымоніі сімвалічнага адкрыцця Беларуска-кітайскага тэхнапарку ў горадзе Чанчунь.

З ініцыятывай стварэння тэхнапарку выступіў Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Беларусі ў лістападзе 2009 года для пашырэння праграм навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва з КНР. Гэты праект рэалізуецца ў зоне высокатэхналагічнай вытворчасці горада Чанчунь. Каля 15 прадпрыемстваў, якія ўваходзяць у яе склад, маюць даўнія ўстойлівыя сувязі з беларускімі навуковымі і інавацыйнымі арганізацыямі, рэгулярна прымалі ўдзел у праграмах навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва. Так, сярод сумесных праектаў — стварэнне прадпрыемства па вытворчасці медыцынскай лазернай тэхнікі, пагадненне аб стварэнні СП па вытворчасці высокадакладнага электрарухавіка. Работа тэхнапарку будзе весціся ў сферы распрацоўкі электронных, лазерных тэхналогій, аграпрамысловых, біятэхналогій і іншых. Такі тэхнапарк плануецца адкрыць і ў Беларусі для стварэння высокатэхналагічных, энерга- і навукаёмістых тэхналогій.

Аляксандр Лукашэнка агледзеў экспазіцыі Нацыянальнага павільёна Кітая. Прэзідэнт узняўся на 12-ы паверх павільёна, дзе быў прадстаўлены прэзентацыйны фільм пра Кітай. У зале «Зямля надзеі» Аляксандр Лукашэнка паглядзеў дэманстрацыйны ролік «Пад адным дахам». Затым ён пакінуў запіс у Кнізе ганаровых гасцей. У якасці сувеніра яму быў уручаны макет Нацыянальнага павільёна Кітая.

Кіраўнік дзяржавы пабываў і ў Нацыянальным павільёне Беларусі, дзе азнаёміўся з яго экспазіцыяй, агледзеў асартымент беларускай прадукцыі, якая прадаецца ў сувенірнай краме. Як заўважылі прадаўцы, вялікай папулярнасцю ў кітайцаў карыстаецца беларускі лён. Слоган беларускай экспазіцыі на выстаўцы — «Горад — скарб», што сімвалізуе скарбніцу нацыянальных культурных каштоўнасцяў, дасягненняў навукі, творчасці і вытворчасці. На фасадзе будынка беларускага павільёна адлюстравана тэматыка гарадскога жыцця чатырох пор года. Асноўны кампазіцыйны элемент унутранай прасторы — два відэасюжэты — «чыстае паветра» і «чыстая вада», якія з'яўляюцца галоўнымі скарбамі нашых гарадоў. На 12 экранах дэманструюцца фільмы аб шасці абласных цэнтрах і шасці малых гарадах, якія ўяўляюць унікальную культурную каштоўнасць. Павільён знаёміць з духоўнымі і прыроднымі багаццямі Беларусі. Тут таксама ёсць экспазіцыя палотнаў вядомых беларускіх мастакоў і работ майстроў-пачаткоўцаў. У сувенірнай краме можна набыць вырабы народных промыслаў, друкаваныя матэрыялы і DVD-дыскі пра Беларусь, маркі, памятныя манеты, гадзіннікі, вырабы з лёну і фарфору. Штомесяц у павільёне праходзяць выступленні народных творчых калектываў з усіх абласцей і Мінска. За час работы Нацыянальнага павільёна Беларусі яго наведалі амаль 5 млн чалавек.

Сусветная выстаўка «ЭКСПА-2010» праводзіцца ў Шанхаі з 1 мая па 31 кастрычніка 2010 года. Удзел у ёй прымаюць 192 дзяржавы і 54 міжнародныя арганізацыі. Тэматыка выстаўкі — «Лепшы горад — лепшае жыццё» — дэманструе намаганні кожнай дзяржавы па стварэнні найбольш камфортнага асяроддзя пражывання насельніцтва гарадоў. «ЭКСПА-2010» задумана арганізатарамі як буйнейшая ў гісторыі сусветных выставак па займаемай тэрыторыі, колькасці наведвальнікаў і колькасці ўдзельнікаў. Пасля наведвання Сусветнай выстаўкі «ЭКСПА-2010» Аляксандр Лукашэнка накіраваўся з Шанхая ў Пекін.

У выніку візіту Прэзідэнта Беларусі ў Кітай у 2005 годзе рэзка актывізаваўся гандаль паміж дзвюма краінамі, а пасля візіту 2008 года — крэдытна-інвестыцыйнае супрацоўніцтва. Сёння бакі пераходзяць да новага этапа супрацоўніцтва — навукова-тэхналагічнага, што з'яўляецца вельмі перспектыўнай формай узаемадзеяння.

Тваe правы

# ЯКІЯ ШАНЦЫ МЕЦЬ АВАНСЫ?

**ВЯДОМЫ яшчэ з савецкіх часоў жарт, што ці не кожны з нас марыць хадзіць на працу толькі два разы ў месяц (у дні авансу і зарплаты), актуальны далёка не заўсёды. Бо не сакрэт: аванс выдаюць не ўсім. І тут, натуральна, узнікаюць пытанні — ці мае рацыю наймальнік; каму аванс выплачваецца абавязкова, у якіх памерах і калі? Разабрацца з гэтым мы паспрабуем з дапамогай намесніка дырэктара Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Ірыны Фёдараўны ШЫЛЯЕВАЙ.**

## Працоўны дагавор або кантракт?

Ці не найбольш папулярнае пытанне — у якіх выпадках выдача авансу з'яўляецца абавязковай? Між тым, раскладка тут даволі простая.

— Артыкул 73 Працоўнага кодэкса прадугледжвае, што выплата зарплаты робіцца рэгулярна ў дні, вызначаныя ў калектыўным дагаворы, пагадненні або ў працоўным дагаворы, але не радзей чым два разы ў месяц, — адзначае Ірына Шыляева. — Для асобных катэгорый работнікаў заканадаўствам могуць быць прадугледжаныя і іншыя ўмовы. У прыватнасці, гаворка пра кантрактнікаў. Дэкрэт № 29 ад 26 ліпеня 1999 года «Аб дадатковых мерах па ўдасканаленні працоўных адносінаў, умацаванні працоўнай і выканальніцкай дысцыпліны» вызначае, што зарплата можа выплачвацца не радзей чым раз у месяц работнікам, якія занятыя на ўмовах кантракту — рэгулярна ў дні, пазначаныя ў тым жа кантракце, калектыўным дагаворы ці пагадненні.

Аднак тут трэба адразу ж зрабіць істотную заўвагу. Пры ўзаемнай згодзе работнікаў і наймальніка і пры выкананні парадку змянення істотных умоў працы ў кантракты можа быць унесены запіс, які дазваляе рабіць выплату зарплаты два разы ў месяц, інакш кажучы, за першую палову месяца — аванс, а за другую палову месяца — канчатковы разлік. Прычым пасля прыняцця змяненняў у кантракт гэтае правіла становіцца абавязковым. І яго парушэнне наймальнікам або службовай асобай наймальніка пацягне адміністрацыйную адказнасць.

— Адказнасць наймальніка або службовай асобы наймальніка за парадак і тэрміны выплаты зарплаты вызначана артыкулам 9.19 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях, — зазначае Ірына Шыляева. — Гэтае парушэнне цягне за сабой накладанне штрафу на наймальніка або службовую асобу наймальніка ў памеры ад 4 да 20, а на юрыдычную асобу — да 100 базавых велічынь.

## Адтэрміноўку з-за свята не робяць

Калі-нікалі вызначаны дзень авансу з'яўляецца непрацоўным. Таму варта памятаць, што аванс — гэта частка зарплаты. І ў такім выпадку дзейнічае агульнае патрабаванне: калі вызначаны для авансу дзень супадае з выхаднымі, дзяржаўнымі святамі ці святочнымі днямі, то выплата павінна рабіцца напярэдадні.

## Калі змяняюцца ўмовы?

Арганізацыя пачынае адчуваць фінансавыя праблемы, і вынікам іх становяцца цяжкасці са своечасовай выплатай авансу. Ці можна з улікам «аб'ектыўных прычын» часова адмовіцца ад яго выдачы работнікам?

— Тэрміны і перыядычнасць выплаты зарплаты адносяцца да істотных умоў працы, аб намеры змяніць якія наймальнік абавязаны пісьмова папярэдзіць работніка не пазней чым за адзін месяц, — падкрэслівае Ірына Шыляева. — Пры гэтым, калі ў сувязі са змяненнем істотных умоў працы работнік ад працягу выканання сваіх абавязкаў адмаўляецца, то дзеянне працоўнага дагавору спыняецца.

## «Стандартных» памераў няма

Не менш цікавая тэма — памер авансу. Існуе даволі распаўсюджаная думка, што ён павінен складаць «палову зарплаты». Але гэта не так.

— Заканадаўства аб працы не прадугледжвае якога-небудзь мінімальнага памеру авансу, які наймальнік абавязаны выплаціць работніку, — заўважае Ірына Шыляева. — Аднак такі памер можа быць вызначаны калектыўным дагаворам ці пагадненнем, іншым лакальным нарматыўным прававым актам наймальніка ці працоўным дагаворам з работнікам.

## Спрэчкі вырашае суд

Не зусім тыповы выпадак, але здараецца, што работнік суму авансу не выкарыстоўвае. У такім выпадку грошы даводзіцца вяртаць. Прычым тут магчымыя тры шляхі — утрыманне з зарплаты работніка на падставе яго заявы, унясенне ў касу арганізацыі паводле прыходнага касавага ордэра і, нарэшце, утрыманне з зарплаты работніка на падставе рашэння наймальніка.

— Пагашэнне запазычанасці шляхам утрымання з зарплаты работніка на падставе рашэння наймальніка можа адбывацца для вяртання грошай, выплачаных залішне ў выніку разліковых памылак, для пагашэння нявыкарыстанага і своечасова не вернутага авансу, выдадзенага на службовую камандзіроўку ці на гаспадарчыя патрэбы пры пераводзе ў іншую мясцовасць, а таксама для вяртання залішне выплачанага авансу ў залік зарплаты, — распавядае Ірына Шыляева. — У гэтых выпадках наймальнік мае права зрабіць распараджэнне аб утрыманні не пазней чым праз месяц з дня канчатковага тэрміну, вызначанага для вяртання авансу ці з дня няправільна разлічанай выплаты. Аднак трэба мець на ўвазе, што ўтрыманне і яго памер на падставе рашэння наймальніка магчымае толькі пры згодзе работніка. Калі ж з памерам утрымання работнік не згодны, то справа вырашаецца ў судзе.

## Жаданне можна задаволіць

Таксама нетыповы выпадак, і тым не менш. Часам работнік адмаўляецца ад атрымання авансу самастойна. Маўляў, «мне больш зручна атрымліваць усё і адразу».

— У такім выпадку пайсці насустрач пажаданням работніка можна, — заўважае Ірына Шыляева. — Аднак, каб не ўзнікала ніякіх непаразуменняў, той жа работнік павінен напісаць заяву з адпаведнай просьбай.

## Грошы. А потым паездка

Тым часам ёсць сітуацыя, калі авансаванне з'яўляецца абавязковым незалежна ад таго, на якіх умовах якога дагавору заняты работнік. Гаворка пра камандзіроўку. Так, нялішне заўважыць, што артыкул 95 Працоўнага кодэкса вызначае: пры службовых камандзіроўках наймальнік абавязаны выдаць аванс на кампенсацыю выдаткаў па праездзе і пражыванні. Калі ж наймальнік гэтым патрабаваннем грэбуе, то поўнае права работніка — проста адмовіцца ад службовай паездкі.

**Сяргей ГРЫБ.**

# ААТ «БЕЛАГРАПРАМБАНК» ПРЫРАСТАЕ ЎКЛАДАМІ

**АБ'ЁМ сродкаў, размешчаных насельніцтвам у ААТ «Белаграпрамбанк», павялічыўся за 9 месяцаў на 30 працэнтаў і па стане на 1 кастрычніка склаў 2,8 трлн рублёў. Па аб'ёме прыцягнутых укладаў насельніцтва Белаграпрамбанк займае другое месца сярод банкаў краіны.**

Найбольшая ўдзельная вага прыцягнутых сродкаў прыпадае на тэрміновыя ўклады «Лінія росту» і «Старт!». Сродкі да запатрабавання складаюць 8 працэнтаў ад агульнай сумы прыцягнутых сродкаў. Рэалізацыя аблігацый дазволіла прыцягнуць каля 208 млрд рублёў. Падтрыманне канкурэнтаздольных умоў прыцягнення грашовых сродкаў у спалучэнні з актыўнымі маркетынгавымі захадамі па ўкараненні фірменнай сістэмы зберажэнняў «Лінія росту» дазваляюць ААТ «Белаграпрамбанк» умацоўваць пазіцыі на рынку прыцягнутых сродкаў фізічных асобаў. У параўнанні з мінулым годам сярэднямесячны прырост апошніх павялічыўся ў 1,4 раза. Значным фактарам з'яўляецца таксама наяўнасць шырокай сеткі падраздзяленняў на ўсёй тэрыторыі краіны — 7 філіялаў, 69 аддзяленняў, 199 разлікова-касавых цэнтраў.

Прырост сродкаў фізічных асобаў у асобныя дні кастрычніка перавышаў 4 млрд рублёў. Набраныя ў верасні-кастрычніку тэмпы дазваляюць Белаграпрамбанку разлічваць на пераадоленне да канца года 3-трыльённай мяжы астаткаў размешчаных насельніцтвам сродкаў.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# У Беларусі на гэтым тыдні рэзка пахаладае

**Аб гэтым паведаміла карэспандэнту БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга ФЯДОТАВА.**

У аўторак уначы па Віцебскай вобласці, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, на паўночным усходзе магчымы мокры снег. Днём узмоцніцца вецер, у многіх раёнах парывы будуць дасягаць 15-20 метраў за секунду. У сераду і чацвер кароткачасовыя дажджы, дзе-нідзе з мокрым снегам. У начныя гадзіны чакаецца ад 4 градусаў марозу да 2 градусаў цяпла, удзень — ад 2 градусаў цяпла на паўночным усходзе да 10 градусаў вышэй за нуль на паўднёвым захадзе краіны. У канцы тыдня на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу, месцамі галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да плюс 3 градусаў, удзень — ад 2 да 10 градусаў цяпла. У нядзелю дзённая тэмпература не перасягне 0-6 градусаў цяпла. Такі тэмпературны рэжым адпавядае лістападаўскай норме (на 3-6 градусаў халадней, чым звычайна).

# У БЕЛАРУСІ НАЙМЕНШЫ ПРАЦЭНТ БЕСПРАЦОЎНЫХ У СНД




Абзац

◢ **У бліжэйшыя дні на дарогах краіны магчымае ўтварэнне галалёдзіцы. У сувязі з гэтым ДАІ рэкамендуе падрыхтаваць аўтамабіль да эксплуатацыі ў асенне-зімовы перыяд. У прыватнасці, замяніць летнія шыны на зімовыя, праверыць спраўнасць тармазной сістэмы, светлавых прыбораў, заліць у бачок шклоамывальніка т.зв. «незамярзайку».**

◢ За апошнія выхадныя (другая палова пятніцы ўключна) у Беларусі зарэгістравана 69 дарожна-транспартных здарэнняў з пацярпелымі, у якіх 17 чалавек загінулі і 65, у тым ліку сем дзяцей, атрымалі траўмы.

◢ **Цэнтральны батанічны сад Нацыянальнай акадэміі навук праводзіць 20 кастрычніка Дзень журавін. На пляцоўцы каля экспазіцыйнай аранжарэі сада з 10 гадзін будзе арганізаваная выстава-продаж ягад і саджанцаў журавін. Іх прывязуць з Ганцавічаў, дзе знаходзіцца эксперыментальная база батанічнага сада па вырошчванні буйнаплодных, ці садовых, журавін.**

◢ Мінчанка трапіла ў 30-метровую вентыляцыйную шахту і засталася жывая. Супрацоўнікі Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС дасталі пацярпелую з шахты. Надзвычайнае здарэнне адбылося на вуліцы П. Броўкі ў Мінску. Са шматлікімі траўмамі жанчыну даставілі ў бальніцу, высвятляюцца прычыны падзення.

◢ **У Гомелі МАЗ з пяском перакуліўся ў вадаём. Пры выездзе з будуемага аб'екта ў мікрараёне «Клянкоўскі» вадзіцель МАЗа не справіўся з кіраваннем, у выніку чаго аўтамабіль перакуліўся ў вадаём каля дарогі. Кіроўца не пацярпеў. МАЗ, гружаны пяском, на поўнай хуткасці пераскочыў бардзюр, знёс металічны слуп і апынуўся больш чым напалову ў вадзе. Вадзіцель змог выбрацца з кабіны, якая была затопленая, і залез у кузаў з пяском, дзе і чакаў выратавання. Пры дапамозе лодкі супрацоўнікі МНС даставілі мужчыну на бераг. Згодна з папярэдняй версіяй, прычынай здарэння стала адмова тармазоў аўтамабіля.**

## Поўны абзац

◢ Дзяўчына з-за помсты прыклеіла сабаку да халадзільніка. 20-гадовая жыхарка Каларада (ЗША) абгарнула сабаку свайго бойфрэнда ўпаковачнай клейкай лентай і прыклеіла жывёлу да халадзільніка ўверх нагамі. Такім чынам яна адпомсціла свайму сябру за тое, што той не хоча пазбавіцца ад свайго чацвераногага сябра. Эбі Тол была арыштаваная за жорсткае абыходжанне з жывёлай. Дзяўчыну пасля затрымання адпусцілі пад залог 12.500 долараў. Па словах паліцэйскіх, яна абвязала клейкай лентай лапы, хвост і морду сабакі, а потым прымацавала яго да халадзільніка. Беднага сабаку адправілі ў прытулак для жывёл.

◢ **Бязрукі кітаец выйграў тэлешоу «Кітай шукае таленты», сыграўшы на фартэпіяна пальцамі ног. 23-гадовы Лю Вэй, які пазбавіўся рук у 10-гадовым узросце, выйграў у фінале, што прайшоў у нядзелю на шанхайскім стадыёне. Хлопец навучыўся граць на фартэпіяна ў 18 гадоў. І на гэты раз ураджэнец Пекіна не пакінуў абыякавымі кітайскіх тэлегледачоў. Ён выканаў песню «Вы цудоўная», віртуозна акампануючы сабе на музычным інструменце нагамі. Усім супернікам шанцаў на перамогу не засталося.**



*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

# ЭКАНАМІЧНЫ СУД СНД ДАЎ БЕЛАРУСІ І РАСІІ ТРЫ МЕСЯЦЫ НА ВЫРАШЭННЕ СПРЭЧКІ ПА ПОШЛІНАХ НА НАФТАПРАДУКТЫ ПА-ЗА СУДОМ

**Тым самым суд задаволіў хадайніцтва расійскага боку, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Перанесці пасяджэнне па спрэчцы аб мытных пошлінах на нафтапрадукты на тры месяцы папрасіў расійскі бок, які спадзяецца за гэты час урэгуляваць спрэчку ў пазасудовым парадку. Акрамя таго, ён плануе ўвесці для работы па справе дадатковых юрыстаў, якім патрэбны час, каб падрабязна азнаёміцца са справай. Беларускі бок у сваю чаргу не супраць пераносу разгляду справы на гэты тэрмін.

## Гэта ж мы, Госпадзі!

### СЫН НА БАЦЬКУ

9 кастрычніка ўвечары ў Асіповічах у пад'ездзе дома знайшлі труп 39-гадовага мужчыны. Як паведаміла прэс-служба Магілёўскага абласнога УУС, гематомы на твары нябожчыка ўказвалі на гвалтоўную смерць. Міліцыя хутка ўстанавіла, што мужчыну на глебе непрыязных адносін збіў яго 17-гадовы сын, а пасля перанёс збітага бацьку з кватэры ў пад'езд, дзе той і памёр. Малады чалавек затрыманы, яго абвінавачваюць у наўмысным учыненні цяжкіх цялесных пашкоджанняў.

**Алена КАЗЛОВА.**

### У ТАКСІ РАБАВАЛІ ТАКСІСТА

У Віцебску два зладзеі ў таксі пад пагрозай нажа адабралі ў вадзіцеля 60 тысяч рублёў. Справа была ўначы. Вадзіцель перавазіў ліхіх пасажыраў на службовым аўто «Опель—Астра». Таксіст адразу звярнуўся па дапамогу ў міліцыю. «Рэкеціраў» па гарачых слядах затрымалі. Аднаму 31 год, другому 26, жыхары Віцебска. Абодва нідзе не працуюць, раней судзімыя за крадзяжы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### АВАРЫЯМ СПРЫЯЕ ЦЕМРА

Вадзіцель легкавушкі з горада Мікашэвічы не разгледзеў у цемры воз, які не быў абазначаны святлоадбівальнымі элементамі, і дапусціў сутыкненне. У выніку кіроўца возу, 61-гадовы жыхар вёскі Сітніца, трапіў у бальніцу з сур'ёзнымі траўмамі.

**Яна СВЕТАВА.**


# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
## на «Комплекс многоквартирных жилых домов со встроенными помещениями общественного назначения по ул. Курганная в г. Минске»

**Информация о застройщике:**

**Застройщик:** Иностранное частное торгово-строительное унитарное предприятие «ГЕРБЕЛИНВЕСТ», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от «26» сентября 2008 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191068402.

**Адрес:** 220004, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Димитрова, 5, пом. 1.

**Режим работы:** пн.–пт. с 9.00 до 18.00, перерыв с 13.00 до 14.00.

**Телефон:** (017) 203 32 78, (017) 203 38 49, факс: (017) 306 24 52.

До настоящего проекта организация не осуществляла функции застройщика жилых домов и иных объектов недвижимости.

**Информация о проекте строительства:** Застройка трех домов.

**Цель проекта строительства** — строительство трех 7–9-этажных многоквартирных жилых домов со встроенными помещениями общественного и административного назначения по генплану:

- 1-я очередь строительства – блок-секции GI-3223-7-Л, GI-21112-8-С, GI-21112-9П;
- 2-я очередь строительства – блок-секции GI-3223-7-Л, GI-21112-8-С, GI-21112-9П;
- 3-я очередь строительства – блок-секции GI-3223-7-Л, GI-21112-8-С, GI-21112-9П.

Здание каждого многоквартирного жилого дома запроектировано из 3 секций, общая площадь жилого здания 6924,85 м², из них жилых помещений (квартир) — 5968,73 м². Количество жилых помещений (квартир) — 108, из них: однокомнатных — 47, двухкомнатных — 45, трехкомнатных — 15, четырехкомнатных — 1. Каждая секция оборудована мусоропроводом, одним грузопассажирскими лифтом. Во всех квартирах предусмотрены летние помещения (остекленные лоджии). Конструкция здания — сборный монолит. Высота этажа – 3 м.

Объект долевого строительства расположен в г. Минске в границах ул. Курганная – ул. Космонавтов, с севера – вдоль лесопарковой зоны по проектируемой улице № 1, с запада и юга существующей усадебной застройкой по ул. Курганной, с востока существующей жилой застройкой по ул. Космонавтов.

**Начало строительства** — октябрь 2010 г.

Ориентировочные сроки окончания строительства жилых домов 1, 2, 3 очереди — 3-й квартал 2011 г.

**Застройщиком получены:**

- государственная экспертиза (заключение Государственного комитета по стандартизации Республики Беларусь РУП «Главгосстройэкспертиза» от 07.10.2010 г. № 1454-15/10);
- решение Минского городского исполнительного комитета от 08.10.2010 г. № 2320 «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении строительства»;
- разрешение специализированной инспекции департамента Госстройнадзора на производство строительно-монтажных работ от 11.10.2010 № 2-203Ж-067/10.

Застройщику на праве временного пользования на период строительства выделены земельные участки общей площадью 3,2250 га решением Минского горисполкома от 08.10.2010 г. № 2320. Собственником земельных участков является Республика Беларусь. Выписка № 364:223/10 от 02.08.2010 г., выдана Республиканским унитарным предприятием «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

Договор генерального строительного подряда заключен с ООО «И энд К груп». Договор от 11.10.2010 № 7, специальное разрешение (лицензия) № 02250/0004316.

Заключение договоров создания объектов долевого строительства будет проводиться поэтапно.

Для физических лиц, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей предлагаются к заключению по договорам создания объектов долевого строительства 100 (сто) квартир, из них:

- однокомнатных — 64 (шестьдесят четыре) квартиры максимальной общей площадью — 57,42 м²;
- двухкомнатные — 24 (двадцать четыре) квартиры максимальной общей площадью — 64,61 м²;
- трехкомнатные — 12 (двенадцать) квартир максимальной общей площадью — 97,06 м².

Стоимость одного метра квадратного в белорусских рублях составляет 2 790 000 (два миллиона семьсот девяносто тысяч) белорусских рублей. Указанная в настоящей проектной декларации цена за 1 м² общей площади по проекту соответствующих квартир и их количество считается действительным до момента опубликования новой декларации.

Оплата предлагаемых к заключению по договорам создания объектов долевого строительства квартир должна быть осуществлена в течение 10 рабочих дней с момента заключения соответствующего договора в размере 100 %.

**Работы по внутренней отделке жилых помещений, выполняемые Застройщиком:**

- бетонная подготовка под укладку полов, гидроизоляция полов в санузлах без окраски стен и потолков;
- электроснабжение – поквартирная разводка электропроводки с установкой электросчетчиков и выводом на кухне для подключения электроплиты;
- вентиляция – непринудительная, приточно-вытяжная;
- горячее и холодное водоснабжение – стояки с приборами учета, установка и подключение унитаза, выводы для кухни и ванны;
- канализация – стояки с поквартирной разводкой трубопроводов к потребителям;
- отопление – водяное, с установкой поквартирных счетчиков учета тепла;
- телефонизация, радиофикация, телевидение – поквартирная разводка.

**Внутренняя отделка мест общего пользования:**

общие коридоры, лифтовые, лестничные пролеты, входные группы.

Иные работы по внутренней отделке Застройщиком не выполняются.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта в эксплуатацию: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые, вентиляционные и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами жилых и (или) нежилых помещений, но обеспечивающее их жизнедеятельность, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность дольщиков, если финансирование этих объектов производилось дольщиками, и передаются Застройщиком по акту приемки передачи представителю товарищества собственников, если на момент ввода дома в эксплуатацию это товарищество создано, если такое товарищество не создано, лицу, определяемому общим собранием Дольщиков, либо уполномоченному местным исполнительным и распорядительным органом.

После выполнения строительно-монтажных работ на прилегающей территории жилого дома будет выполнено благоустройство и озеленение согласно утвержденного генерального плана.

Срок действия настоящей проектной декларации — до момента опубликования новой проектной декларации, которая отменяет действие опубликованных ранее.

**Информацию по объекту долевого строительства и условиям заключения договоров можно получить в уполномоченной риэлтерской организации ОДО «Твоя столицаконсалт», лиц. № 02240/0071685, 06.09.06-11 Минюст Республики Беларусь, риэлт. услуги. УНП 190285638 по адресу: г. Минск, ул. Шафарнянская, д. 11, тел.: (017) 286 38 38, (029) 381 01 01, адрес в интернете www.t-s**



**КПУП «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) извещает о проведении 28 октября 2010 года повторного открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-17**

| № ЛОТА | Инвентарный № | Наименование | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2037 | Здание столовой с сетями водопровода, канализацией, дорогами, тротуарами, забором, линией электроснабжения | 566 595 000 | 56 000 000 |
| 2 | 6202 и 6203 | Здания специализированных складов | 199 085 000 | 19 000 000 |

**Продавец:** Республиканское унитарное предприятие «Гомельский судостроительно-судоремонтный завод» (признан банкротом с санацией, решением хоз. суда Гомельской обл. от 05.11.2004 г.), г. Гомель, ул. Подгорная, 10. Тел. (8 0232) 74 47 83.

**Имущество расположено по адресу:** г. Гомель, ул. Подгорная, 10 и принадлежит РУП «Гомельский судостроительно-судоремонтный завод». **Шаг аукциона – 5 %.**

К участию в аукционе допускаются лица, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе по форме, определенной организатором аукциона, внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, представили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2-17** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения **по 26 октября 2010 г. включительно.** Подача документов по почте не допускается.

**Задаток для участия в аукционе перечисляется на расчетный счет продавца (РУП « Гомельский судостроительно-судоремонтный завод») № 3012000700019 в филиале ОАО «БелПСБ» по Гомельской области, МФО 151501360, УНП 400063195.**

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; в течение 30 календарных дней от даты проведения аукциона оплатить приобретаемое имущество и возместить затраты на организацию и проведение аукциона. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» № 173 от 04.09.2010.

**Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74 17 34, 74 89 64.**



**КПУП «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) извещает о проведении 16 ноября 2010 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-18**

| № лота | Наименование | Инвентарный номер | Адрес объектов | Начальная цена продажи объекта, с учетом НДС, бел. руб. | Задаток, с учетом НДС, бел. руб |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение (общей площадью 151,9 кв.м) здание бани | № 311/С-33942 | Гомельская область, Добрушский район, Тереховский поселковый Совет, д. Тереховка, ул. Ленина, 150а | 10 920 000 | 1 900 000 |

**Продавец:** Частное Сельскохозяйственное унитарное предприятие «Тереховка-Агро», Гомельская область, Добрушский район, 247070, ул. Ленина, д. Тереховка. **Шаг аукциона – 5 %.**

К участию в аукционе допускаются лица, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе по форме, определенной организатором аукциона, внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, представили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2–18** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения **по 12 ноября 2010 г. включительно.** В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

**Задаток для участия в аукционе перечисляется на расчетный счет продавца (Частное Сельскохозяйственное унитарное предприятие «Тереховка-Агро»): р/с 3012230370016, РКЦ № 12 в г. Добруше ф-ла ОАО БАПБ ГОУ, МФО 912, УНП 490419273.**

**Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74 17 34, 74 89 64.**

Прафілактыка

# ДЫЯБЕТ І ЗДАРОЎЕ НОГ

**ЦУКРОВЫ дыябет часта прыводзіць да такіх небяспечных ускладненняў, як захворванні сардэчна-сасудзістай сістэмы, пагаршэнне зроку і парушэнне функцыі нырак. Ногі таксама ўваходзяць у лік органаў-мішэняў цукровага дыябету — магчымае развіццё сіндрому дыябетычнай ступні.**

Сіндром дыябетычнай ступні (СДС) — комплекс анатама-функцыянальных змяненняў ступні, які праяўляецца ў выглядзе трафічных язваў, скурна-сустаўных пашкоджанняў і гнойна-некратычных працэсаў.

Ад моманту дэбюту цукровага дыябету да з'яўлення ўскладненняў, што пагражаюць ступням, мінае 7—15 гадоў. Гангрэна ніжніх канечнасцяў у хворых на цукровы дыябет сустракаецца ў 20 разоў часцей, чым у асоб без цукровага дыябету.

Узровень цукру ў крыві, павышаны на працягу шэрагу гадоў, пашкоджвае нервовыяканчаткі і сасуды ніжніх канечнасцяў, з-за гэтага развіваецца нейрапатыя і ангіяпатыя, якія з'яўляюцца асноўнымі фактарамі для развіцця СДС. Пацыенты з такімі праблемамі складаюць групу рызыкі СДС. Існуюць і так званыя «малыя праблемы» ступняў, якія таксама павышаюць рызыку «дыябетычнай ступні». Да іх адносяцца:

- дэфармацыі ступняў (звязаныя не толькі з дыябетам, але і з узроставымі зменамі суставаў, нашэннем «няправільнага» абутку і інш.);
- гіперкератоз (лішкавае ўтварэнне мазалёў);
- патаўшчэнне і змяненне формы пазногцяў;
- грыбковае пашкоджанне пазногцяў і скуры (асабліва міжпальцавых прамежкаў).

Ступня — асноўны ўчастак чалавечага цела, які ажыццяўляе функцыю апоры, і таму пры спалучэнні пашкоджанняў нерваў і сасудаў, выкліканых дыябетам, вельмі схільная да розных траўмаў. У выніку любыя дробныя траўмы скуры ступняў не адчуваюцца чалавекам (паколькі дыябетычная нейрапатыя зніжае адчувальнасць і боль можа практычна не непакоіць) і марудна загойваюцца (з-за высокага ўзроўню цукру крыві, зніжэння імунітэту, далучэння інфекцыі і ангіяпатыі — пашкоджання пераважна дробных артэрый, з парушэннем кровазвароту). У сваю чаргу, любая нават нязначная траўма скуры можа ператварыцца ў рану, якая працяглы час не загойваецца, — так званую трафічную язву. Далейшае прагрэсаванне працэсу можа прывесці да сапраўднай катастрофы і больш цяжкіх ускладненняў — глыбокіх гнойных працэсаў, гангрэны, ампутацыі.

## Як папярэдзіць ускладненні цукровага дыябету з боку ног?

У больш чым 90 % выпадкаў вялікая трагедыя і страта канечнасці пачынаецца з банальных дробязяў, элементарнага недагляду і невыканання простых правілаў догляду ступняў або, магчыма, у выніку няведання гэтых правілаў самім хворым і адсутнасці рэкамендацый урачоў. І калі на этапе ранніх паталагічных змяненняў у ступні чалавек не паклапаціўся пра сябе сам, не надалі належнай увагі праблеме пацыента эндакрынолаг, неўролаг, тэрапеўт, то хвораму гарантаваная сумнеўная радасць сустрэчы з хірургам і дастаткова доўгае лячэнне.

## Правілы догляду ног для дыябетыкаў

- Штодзень аглядайце галёнкі і ступні. Аглядайце на наяўнасць парэзаў, драпін, пачырванення і ацёчнасці ступні, прамежкі паміж пальцамі, вобласць шчыкалатак. Пры неабходнасці выкарыстоўвайце люстэрка.
- Штодзень мыйце ногі. Мыйце ногі цёплай вадой, але не парце іх у вадзе, паколькі гэта прыводзіць да змывання ахоўнага слою і высыхання. Пераканайцеся, што вада цёплая, а не гарачая. Выцірайце (прамочваць, а не церці!) ногі насуха, асабліва паміж пальцамі.
- Увільгатняйце ногі для захавання мяккасці скуры. Прымяняйце спецыяльны крэм (вітамінізаваны, бактэрыцыдны). Аднак не змазвайце крэмам прамежкі паміж пальцамі, бо гэта можа садзейнічаць інфіцыраванню.
- Не займайцеся самалячэннем. Калі ў вас з'явіліся скурачкі, мазалі або агрубелая скура, звярніцеся да доктара.
- Рэгулярна стрыжыце пазногці. Стрыжка пазногцяў папярэджвае раздражненне скуры пальцаў. Стрыжыце пазногаць прама, не зразайце вуглы. Пры дрэнным зроку самастойна стрыгчы пазногці забаронена! Пры змяненні колеру пазногцяў, іх патаўшчэнні або ўрастанні ў мяккія тканкі, неабходна звярнуцца да доктара.
- Заўсёды насіце шкарпэткі і абутак. Варта насіць шкарпэткі і абутак нават у доме, каб папярэдзіць траўматызацыю ног. Лепш за ўсё выкарыстоўваць спецыяльныя дыябетычныя шкарпэткі, без швоў, якія маюць некаторую набіўку. Не забывайце заўсёды перад адзяваннем шкарпэтак правераць іх змесціва,каб зноў-такі пазбегнуць траўматызацыі.
- Абутак не павінен сціскаць ступню. Абутак не вашага памеру можа прывесці да з'яўлення вадыроў і язвачак. Сачыце за тым, каб нагам было зручна ў абутку. Насіце абутак з закругленым наскам і нізкім абцасам.
- Засцерагайце ногі ад холаду і гарачыні. Не хадзіце басанож па гарачых паверхнях. Не рэкамендуецца трымаць блізка ногі каля радыятараў або абагравальнікаў. Не прыкладвайце да ступняў грэлкі або бутэлькі з гарачай вадой. Для засцярогі ад холаду надзявайце шкарпэткі.
- Падтрымлівайце крываток у нагах. Размінайце пальцы ног і згінайце ступні па 5 хвілін 2—3 разы на дзень. Запомніце: не варта на працяглы час скрыжоўваць ногі. Не надзявайце шкарпэткі з тугімі рызінкамі.
- Фізічныя практыкаванні паляпшаюць цыркуляцыю крыві. Займіцеся хадой, танцамі, плаваннем, яздой на веласіпедзе.

**УВАГА!** Нават пры поўным здароўі ног узровень цукру ў крыві павінен заставацца пад пастаянным кантролем, каб пазбегнуць магчымых ускладненняў.

## Калі звяртацца да спецыяліста?

- пры развіцці ўрослага пазногця;
- пры апёках, ранах любога памеру;
- пры пацямненні пальцаў, з'яўленні боляў у лытках падчас хады і ў спакоі;
- пры страце адчувальнасці ступняў;
- пры язвах і нагнаеннях.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

# Шум на рабоце павялічвае рызыку ўзнікнення сардэчна-сасудзістых захворванняў

**ПРАЦЯГЛАЕ ўздзеянне шуму на рабочым месцы садзейнічае павелічэнню рызыкі ўзнікнення сардэчна-сасудзістых захворванняў. Да такой высновы прыйшлі супрацоўнікі Універсітэта Брытанскай Калумбіі (ЗША) у выніку даследавання, у якім прынялі ўдзел 6 тыс. працуючых жыхароў Злучаных Штатаў, паведамляюць інфармагенцтвы.**



Амерыканскія вучоныя выкарысталі ў сваёй рабоце анкеты амерыканцаў, уключаных у Нацыянальнае апытанне па вывучэнні здароўя і харчавання. Звесткі пра ўдзельнікаў апытання фіксаваліся з 1999 па 2004 год. Удзельнікі даследавання былі падзелены на дзве групы ў залежнасці ад умоў працы. У першую ўвайшлі работнікі, на якіх бесперапынна аказваў уздзеянне моцны шум на працягу мінімум трох месяцаў, у другую — усе астатнія. Моцным аўтары даследавання лічылі шум, які прымушае павышаць голас, каб быць пачутым чалавекам, які знаходзіцца побач. Згодна з вынікамі апытання 21 працэнту ўдзельнікаў даводзілася працаваць у такіх умовах на працягу дзевяці месяцаў і больш. Гэтыя людзі часцей аказваліся курцамі і часцей за іншых пакутавалі ад лішняй вагі ў параўнанні з тымі, хто працаваў у больш камфортных умовах.

Паводле падлікаў даследчыкаў, працяглае ўздзеянне шуму на рабоце было звязана з павелічэннем верагоднасці стэнакардыі ў 2,9 раза, каранарнай недастатковасці — у 2 разы, ізаляванай дыясталічнай гіпертэнзіі — у 2,3 раза. Найбольш высокай рызыка пералічаных захворванняў была сярод мужчын, удзельнікаў маладзейшых за 50 гадоў і курцоў. Атрыманыя звесткі сведчаць пра тое, што павышаны ўзровень шуму на рабочым месцы заслугоўвае пільнай увагі як важны фактар рызыкі ўзнікнення сардэчна-сасудзістых захворванняў, адзначаюць аўтары даследавання.

Справаздача аб даследаванні апублікавана ў часопісе Occupational and Environmental Medicine.

Жаночыя сакрэты

# КРАСНУХА ЗВОДЗІЦЬ РАХУНКІ

**Гэта бяскрыўдная дзіцячая хвароба становіцца небяспечнай, калі «падчапіць» яе падчас цяжарнасці...**

У савецкую эпоху ў дарослых людзей яна была рэдкасцю, бо практычна ўсе грамадзяне і грамадзянкі ў пяшчотным узросце наведвалі дзіцячыя садкі і яслі. Пазнаёміўшыся з дзіцячымі інфекцыямі, імунітэт малога станавіўся «абстраляным», гатовым да адбіцця любой інфекцыі і выключаў паўтарэнне ўжо перанесенай немачы. Сёння ж многія дзеці да школы выхоўваюцца дома, іх спецыфічны імунітэт слабы, таму і рызыка заражэння краснухай у сталым узросце вельмі высокая. Аднак страшная не сама верагоднасць краснухі ў дарослых дзядзькаў і цётак (хоць гэта злапамятная «дама» заўсёды рада магчымасці звесці рахункі з тымі, хто раней яе «ігнараваў»). Найбольшую небяспеку краснуха ўяўляе для жанчын у самы ўразлівы перыяд іх жыцця — падчас цяжарнасці. Бо менавіта гэтая немач з'яўляецца частай прычынай нараджэння дзяцей з парокамі развіцця.

Сярод інфекцыйных захворванняў краснуха — самая сур'ёзная, і сустрэцца з ёю можна ўсюды. Яна адносіцца да групы вірусаў, таму не мае ніякага «супрацьяддзя» — гэта значыць эфектыўнага лячэння, акрамя вакцынацыі.

Калі вам, будучай маме, краснуха пагражае толькі сыпам на целе і дрэнным самаадчуваннем, то вашаму дзіцяці — самымі жахлівымі наступствамі. Дзіця ў маці, якая хварэла напачатку цяжарнасці на краснуху, — нежыццяздольнае або паражонае такімі немачамі, як глухата, слепата, парокі сэрца, нервовай сістэмы, шкілета.

### БУДЗЬЦЕ АСЦЯРОЖНЫМІ

Найбольш небяспечны першы трыместр цяжарнасці, калі адбываецца развіццё ўсіх важных органаў плода. Таму ва ўсім свеце прынята спыняць цяжарнасць, калі жанчына захварэла на краснуху ў першыя месяцы.

Дзеці пераносяць краснуху, як правіла, лёгка, аднак да дарослых яна не такая паблажлівая. Высыпцы на скуры могуць папярэднічаць агульная слабасць, галаўны боль, дрыжыкі з павышэннем тэмпературы да 38 градусаў, боль у горле, суставах, насмарк і, як правіла, павелічэнне лімфавузлоў, асабліва на патыліцы і на задняй паверхні шыі. Лячэнне — частае піццё і зніжэнне тэмпературы.

### ЯК ПАЗБЕГНУЦЬ ЗАРАЖЭННЯ

Вы, безумоўна, можаце і не памятаць, хварэлі на краснуху ў дзяцінстве ці не. Аднак гэта дастаткова проста высветліць па аналізе крыві на наяўнасць антыцел. Калі па выніках даследавання стане зразумела, што ўзровень вашага спецыфічнага імунітэту нізкі, то прышчэпку неабходна зрабіць за 2—3 месяцы да пачатку плануемай цяжарнасці. Усе сучасныя вакцыны супраць краснухі валодаюць 95—100-працэнтнай эфектыўнасцю. Імунітэт, імі створаны, захоўваецца больш за 20 гадоў, а вакцынацыя складаецца ўсяго з адной прышчэпкі.

### ВАКЦЫНУ МНЕ!

Прышчэпленая мама перадае антыцелы супраць краснухі з мацярынскім малаком. Такая пасіўная імунізацыя не забяспечыць малому поўную засцярогу ад хваробы, але, заразіўшыся, дзіця будзе лягчэй пераносіць немач, самастойна выпрацоўваючы ўласны спецыфічны імунітэт. Гэту прышчэпку ні ў якім разе нельга рабіць падчас цяжарнасці, паколькі высокая верагоднасць пашкоджання плода вакцынным вірусам.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

Сенненскі раён.

СУСЕДСКІЯ ПАСЯДЗЕЛКІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# Не забыць патрэніраваць памяць

**Калі аднойчы мы ўсведамляем, што наша памяць «падстаўляе» нас — мы забываем штосьці зрабіць, задумваемся пры адказе на элементарнае пытанне і г.д., — нас непакоіць прычына такога становішча.**

На жаль, прычын пагаршэння памяці не пералічыць, кажа валеолаг 23-й дзіцячай гарадской паліклінікі г. Мінска Алена ГАРНІЦКАЯ. Гэта і авітаміноз, і стрэсы, і ўзрост. Але памяць можна і трэба трэніраваць. Гэтак жа, як мы трэніруем цягліцы. У наш час існуе нямала дапаможнікаў, прысвечаных праблеме, аднак мы можам трэніраваць і развіваць сваю памяць, не прыкладаючы нейкіх асаблівых намаганняў, не наведваючы спецыяльных семінараў. Так, паляпшэнню разумовай дзейнасці спрыяе дробная маторыка: такія заняткі як вязанне кручком, вышыўка, калі мы мімаволі вымушаныя падлічваць колькасць петляў, думаць пра тое, як удала падабраць колеры і г.д. Прыгадаем таксама вядомую ісціну «рух — гэта жыццё». Фізічныя практыкаванні дапамагаюць актывізаваць кровазварот, што, у сваю чаргу, спрыяе насычэнню клетак мозгу кіслародам. Дапамагае і такая няхітрая трэніроўка. Паспрабуйце паўтарыць 10-12 слоў, напісаных кімсьці на паперцы (можна і ў адваротным парадку). Не ўпадайце ў паніку, калі вынік не парадуе вас. Праз тыдзень трэніровак вы зможаце ганарыцца сабой. Развівайце асацыятыўнае мысленне, будуйце ўласныя лагічныя ланцугі, падключайце да запамінання пах і гук — у кожнага з нас ёсць куткі памяці, якія ажываюць, калі мы чуем музыку, удыхаем водар духоў, адчуваем пах вогнішча, хвоі ці апельсіна. Разгадванне сканвордаў, завучванне вершаў, складанне пазлаў, вывучэнне замежнай мовы — усё гэта таксама дапамагае трымаць памяць у тонусе. Можна прыдумаць і ўласныя практыкаванні для памяці. Напрыклад, па дарозе на працу, седзячы ў аўтобусе, падлічвайце колькасць машын, якія вас абганяюць.

У любой аптэцы вам парэкамендуюць вітамінныя комплексы і лекі для паляпшэння мазгавой дзейнасці і ўмацавання памяці. Але памятайце, што праца вашага мозгу ў многім залежыць і ад правільнага харчавання. Не забывайце ўключаць у рацыён яйкі перапёлак, арэхі, курагу, аліўкавы алей, морапрадукты, печань.

Інфарм-укол

# Ранняя сівізна — не ад добрага жыцця

**Лічыцца, што з'яўленне сівізны — з'ява незваротная. Чалавек сталее, у валасах выпрацоўваецца менш меланіну (пігменту, які вызначае афарбоўку не толькі скуры, але і валасоў), і колер паступова губляецца. З прыродай не паспрачаешся, аднак чым патлумачыць той факт, што серабрыстыя пасмачкі з'яўляюцца на скронях зусім маладых, нават да 30 гадоў, жанчын і мужчын?**

Сярод медыкаў няма адназначнага адказу на пытанне, чым абумоўленая ранняя сівізна — збоямі ў эндакрыннай сістэме, спадчыннасцю або іншымі фактарамі. Але ўрачы адзінадушныя ў тым, што ранняя сівізна — гэта не заўчасная старасць, а «званочак», які папярэджвае пра непаладкі ў арганізме і, магчыма, абарончая рэакцыя арганізма на непамерныя нагрузкі. У адных такія нагрузкі прыводзяць да інфаркту, у другіх — да язвы страўніка, а ў некага — да заўчасных сівых пасмаў. На жаль, выраз «прачнуўся сівым» — не выдумка. Дастаткова прыгадаць каралеву Францыі, Марыю-Антуанету, якая, па сведчанні гісторыкаў-відавочцаў, пабялела ў ноч перад пакараннем смерцю.

Цяжкія перажыванні прыводзяць да спазму сасудаў галаўнога мозгу і дробных сасудзікаў, якія сілкуюць кожны волас. У выніку валасы могуць страчваць пігмент, а таксама выпадаць. «Сярэбраны век» набліжае і няправільнае, беднае на бялкі, харчаванне, парушэнне рэжыму дня, начное сядзенне перад камп'ютарам. Так што, прыгажосць нашай шавялюры напрамую залежыць ад ладу жыцця, які варта накіраваць у больш спакойнае рэчышча. Прыгадаем і бабуліны рэцэпты. Бабулі ведалі, што з'яўленне сівізны можна папярэдзіць, прымаючы адвар з кветак канюшыны. 20 г кветак канюшыны заліць 200 г кіпеню, настояць на працягу 30 хвілін, працадзіць. Прымаць 3 разы ў дзень па 2-3 сталовыя лыжкі. Не менш эфектыўна дапамагае змагацца з сівізной сок пятрушкі і сельдэрэю, які варта прымаць па 2-3 сталовыя лыжкі ў дзень.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# Вучоныя навучыліся чытаць думкі чалавека

**Група вучоных з Універсітэта амерыканскага штата Юта распрацавала тэхналогію па пераўтварэнні электрамагнітных сігналаў галаўнога мозга ў словы і цэлыя сказы, паведамляюць інфармагенцтвы.**

Навацыя методыкі заключаецца ў тым, што яна выкарыстоўвае новы тып непранікальнага мікраэлектрода, які не ўжыўляецца ў мозг, а размяшчаецца прама на ім.

Эксперыментальныя работы вяліся з пацыентамі, якія страцілі здольнасць да мовы з-за эпілепсіі. Здымаючы электрамагнітныя сігналы мозга знешнімі дэтэктарамі, спецыялісты пераводзілі іх у лічбавы сігнал і затым з дапамогай спецыяльнай праграмы пераваралі ў словы, якія вымаўляў камп'ютар.

На падставе сабранай інфармацыі і звестак энцэфалаграфіі ў рэальным часе вучоныя вызначалі, якія менавіта словы вымаўляе чалавек у думках. Сцвярджаецца, што ў асобных тэстах тэхналогія не памылілася ў 90% выпадкаў.

Спецыялісты прызнаюць, што пакуль якасць разумення не вельмі высокая, а набор слоў абмежаваны, аднак даследчыкі ўпэўненыя ў магчымасці паляпшэння тэхналогіі і практычнага ўкаранення вынаходства ўжо праз некалькі гадоў.

Паводле слоў вучоных, іх распрацоўка дазволіць людзям, якія страцілі ў выніку траўмаў і хваробаў здольнасць да стасункаў, кантактаваць з навакольнымі проста з дапамогай думак.

Лечымся без лекаў

# Эхінацыя — для пругкай скуры

**Урэдкім садзе сёння не сустрэнеш гэтую цудоўную кветку. Бледна-ружовыя, ярка-ружовыя і амаль пурпурныя, радзей белыя рамонкападобныя кветкі эхінацыі прыцягваюць наш позірк. Гэтая расліна не толькі ўпрыгажэнне садоў, але і каштоўнае лякарства для чалавека. Эхінацыя аказвае супрацьзапаленчае і імунастымулюючае дзеянне. А нядаўнімі даследаваннямі выяўлена, што рэчывы, якія ўваходзяць у склад эхінацыі, блакіруюць фермент гіялуранідаза, засцерагаючы ад разбурэння гіялуронавую кіслату. Апошняе вельмі важна ведаць жанчынам, якія клапоцяцца аб прыгажосці скуры, яе маладосці і пругкасці.**

Вырашчаныя ў садзе расліны ўжо на другі год жыцця здольныя аддзячыць нам сваім гаючым сокам. Таму, перш чым набываць дарагія крэмы, у склад якіх уваходзіць экстракт эхінацыі, лепш пасадзіць пабольш гэтых раслін у кветніках і навучыцца іх выкарыстоўваць у касметычных мэтах. Вось найбольш простыя і даступныя сродкі догляду скуры.

*У хатніх умовах можна прыгатаваць касметычны лёд, які не толькі асвяжыць, але і падцягне скуру твару.*

1 сталовую лыжку зялёнай гарбаты заварыце шклянкай кіпеню звычайным спосабам. 2 сталовыя лыжкі здробненага лісця эхінацыі заварыце 300 мл кіпеню, настойвайце на вадзяной лазні 30 хвілін, астудзіце, працадзіце і злучыце з настоем зялёнай гарбаты. Разліце сумесь па формачках для лёду. Штодзень раніцай працірайце кавалачкам лёду твар і не выцірайце яго, даючы высахнуць натуральным чынам. Такое «ўмыванне» праводзьце на працягу 2 месяцаў, затым можна змяніць склад настою для лёду, напрыклад, увёўшы замест зялёнай гарбаты рамонак аптэчны.

*Эхінацыя валодае цудоўнай уласцівасцю аздараўляць скуру пры апёках, герпесе, дробных драпінах і язвах. Таму можна проста праціраць пашкоджаныя ўчасткі скуры адварам або сокам эхінацыі. Для гэтага свежы сок варта разводзіць гатаванай вадой у прапорцыі 1:5.*

*Падлеткі, якія пакутуюць ад вугрыстага сыпу, таксама ацэняць гаючыя ўласцівасці эхінацыі. Ім варта штодзень умывацца сокам эхінацыі, змешаным з вадой у прапорцыі 1:10.* Эфектыўныя і такія кампрэсы: свежы сок эхінацыі разбаўляюць гатаванай вадой у прапорцыі 1:2, намочваюць у ім сурвэтку і накладваюць на пашкоджаныя ўчасткі скуры, накрываюць шчыльнай цёплай сурвэткай і трымаюць кампрэс 15—20 хвілін. Курс — 7—10 дзён.

*Пры вуграх і іншых захворваннях скуры вельмі карысна праводзіць сокатэрапію (курс — 8 тыдняў).* Для гэтага вам спатрэбіцца па 100 мл свежаадціснутага соку крапівы двухдомнай і эхінацыі пурпурнай. Раніцай піце сок крапівы, а вечарам сок эхінацыі, разведзены гатаванай вадой 1:3.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

Здароўе на талерцы

## Сярэбраныя ніці ў валасах

**З'явіліся першыя сівыя валасы... Няўжо старасць прыйшла?! Вядома ж, не!**

Ранняя сівізна бывае генетычна запраграмаванай, але таксама ўзнікае і з-за няправільнага харчавання. Напрыклад, калі ў вашым рацыёне нестае цынку. Ён, разам з меддзю і жалезам, вядзе барацьбу з ранняй сівізной.

Шукайце цынк у грыбах, морапрадуктах, ялавічыне, арэхах і семках. На медзь багатыя какава, печань траскі і кальмары, а жалеза лепш за ўсё «здабываць» з ялавічыны, бабовых і грэчкі. Але не з кашы, а з сырых крупаў. Грэчку трэба прамыць, высушыць на патэльні і здрабніць у кавамолцы. Прымаць па 1 ст. лыжцы 3 разы на дзень за 30 хвілін да яды.

## Ягадная гарбата ад прастуды

**Усім добрая маліна. Але, аказваецца, па колькасці вітамінаў ягады прыкметна саступаюць малінніку.**

Каб прыгатаваць і смачны, і лекавы напой, змяшайце ў роўных прапорцыях сушанае лісце і ягады маліны. Заліце жменьку сумесі 1 літрам кіпеню і настойвайце 10 хвілін. Піце, не разбаўляючы, з мёдам па кубку перад сном і адразу ж кладзіцеся ў пасцель, каб узмацніць сагравальны і заспакаяльны эфект гарбаты.

## Замест вітамінаў

**Ідэальнай біялагічна актыўнай дабаўкай можа стаць пылок раслін, які збіраецца пчоламі, а таксама пярга — прадукт ферментацыі пылку. Прычым найлепшы эфект назіраецца ад прымянення гэтых рэчываў разам.**

Пылок — прыродны полівітамін, ён утрымлівае бялкі, тлушч, вітаміны і іншыя біялагічна актыўныя рэчывы. Гэты прадукт нармалізуе апетыт, перашкаджае старэнню, паляпшае зрок. Пылок прымяняюць для прафілактыкі атэрасклерозу і гіпертаніі, а таксама для лячэння малакроўя, хвароб сардэчна-сасудзістай і мочапалавой сістэм. Дарослым людзям дастаткова прымаць па 1/2 сталовай лыжкі пылку, дзецям — па 1/2 чайнай лыжкі 2 разы на дзень.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

# НОВЫ ВІД ГАНДЛЮ: СПЕРМА — ЗА ГРОШЫ...

**УВялікабрытаніі збіраюцца праверыць законнасць сайтаў знаёмстваў, прызначаных для жанчын, якія шукаюць донараў спермы.**

Увагу Брытанскага агенцтва па рэпрадуктыўных тэхналогіях і эмбрыялогіі прыцягнулі спецыялізаваныя сайты, якія прадастаўляюць паслугі па пошуку і падборы мужчын, гатовых стаць донарамі спермы. Рэгістрацыя і карыстанне такімі сайтамі з'яўляюцца платнымі. Як правіла, жанчыны, якія знайшлі патэнцыяльнага донара, самастойна дамаўляюцца з ім пра сустрэчу, а таксама пра форму перадачы донарскага матэрыялу.

Папулярнасць падобных інтэрнэт-сайтаў тлумачыцца часткова дэфіцытам сертыфікаваных донараў спермы ў Вялікабрытаніі. Гэты дэфіцыт, у сваю чаргу, абумоўлены замацаванай на заканадаўчым узроўні ананімнасцю донарства, а таксама абмежаваннямі на матэрыяльнае заахвочванне донарства спермы. Гандаль палавымі клеткамі чалавека без ліцэнзіі забаронены брытанскім заканадаўствам, як небяспечны для здароўя: максімальнае пакаранне за такое правапарушэнне складае два гады пазбаўлення волі.

Першы суд над уладальнікамі інтэрнэт-сайта, які адкрыта гандляваў спермай без адпаведнай ліцэнзіі, распачаўся ў Вялікабрытаніі ў верасні. Улады змаглі прад'явіць абвінавачанні арганізатарам нелегальнага бізнэсу, паколькі іх сайт не толькі прадстаўляў паслугі па пошуку донараў спермы, але і ажыццяўляў платную дастаўку біяматэрыялу. Большасць жа аналагічных сэрвісаў у Вялікабрытаніі абмяжоўваюцца функцыямі службы знаёмстваў, таму і прад'явіць ім абвінавачанні куды больш складана.

«Закон забараняе гандляваць спермай, аднак мы гэтым і не займаемся, а проста знаёмім людзей адно з адным, таму што з'яўляемся сацыяльнай сеткай», — заявіла ўладам заснавальніца аднаго з сайтаў, які прыцягнуў увагу Брытанскага агенцтва па рэпрадуктыўных тэхналогіях і эмбрыялогіі. Гэты сайт функцыянуе ўжо больш за чатыры гады. За гэты час на ім зарэгістраваліся больш за 15 тысяч чалавек, кожны з якіх плаціць за рэгістрацыю па 10 фунтаў у месяц. Між іншым, стваральнікі сайтаў не выключаюць, што некаторыя наведвальнікі могуць выкарыстоўваць іх для пошуку выпадковых сэксуальных партнёраў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**


**ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗДАНИЙ, СООРУЖЕНИЙ И ПОМЕЩЕНИЙ, НАХОДЯЩИХСЯ В РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ, опубликованное в газете «Звязда» 07 ноября 2010 года, дополнить позициями 2-5:**

| № лота | Наименование объекта аренды, его характеристика (год постройки, общая площадь, коммунальные услуги при наличии) | Адрес объекта аренды, контактный телефон для осмотра объекта | Арендуемая площадь, кв.м | Начальная цена права заключения договора аренды с НДС (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 2 | 991 – склад, 1991 г., 1559,5 м², электроснабжение, водоснабжение, без отопления | г. Гродно, ул. Хвойная, 1, тел. 8 0152 55 43 39 | 20,9 кв.м | 219450 | 10000 |
| 3 | 991 – склад, 1991 г., 1559,5 м², электроснабжение, водоснабжение, без отопления | г. Гродно, ул. Хвойная,1, тел. 8 0152 55 43 39 | 19,3 кв.м | 202650 | 10000 |
| 4 | 991 – склад, 1991 г., 1559,5 м², электроснабжение, водоснабжение, без отопления | г. Гродно, ул. Хвойная, 1, тел. 8 0152 55 43 39 | 17,3 кв.м | 181650 | 8000 |
| 5 | 991 – склад, 1991 г., 1559,5 м², электроснабжение, водоснабжение, без отопления | г. Гродно, ул. Хвойная, 1, тел. 8 0152 55 43 39 | 21,8 кв.м | 228900 | 10000 |

**Дату проведения аукциона «08 ноября 2010 года» изменить на «12 ноября 2010 года»** УНП 190562963.

Ад прадзедаў...

# Як адрадзілі старажытны абрад

**У вёсцы Орля Шчучынскага раёна адбыўся фэст фальклорнай песні «Прынёманскія напевы» з прэзентацыяй народнага абраду «Багатыр». Фэст быў падтрыманы сумесным праектам Еўрапейскага саюза і Праграмы развіцця ААН «Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні». Мы спыталі ў яго піяр-каардынатара Вячаслава Смірнова: чаму менавіта Орля прыцягнула ўвагу?**

Па словах Вячаслава Смірнова, Орля — гэта не зусім звычайная вёска. Шмат гадоў яна з'яўляецца культурным і эканамічным цэнтрам раёна, у вёсцы ў пачатку мінулага стагоддзя пражывала каля дзесяці тысяч чалавек. У Орлі перад вайной рэгулярна праходзілі кірмашы, быў духавы аркестр, ладзіліся летнія скаўцкія лагеры, мелася вельмі неблагая па тым часе зона адпачынку на Нёмане са стралковым цірам, пракатам лодак і катамаранаў. І нам вельмі прыемна, што сёння жыхары Орлі, сельскі Савет, мясцовая ўлада раёна імкнуцца зрабіць вёску прыкладам для іншых малых населеных пунктаў вобласці па адраджэнні традыцый і абрадаў дзедаў і прадзедаў, гаворыць Вячаслаў Смірноў.

З гэтай нагоды ў Орлі і прайшла прэзентацыя абраду «Багатыр». Ён, расказвае Вячаслаў, у народзе асацыюецца з багаццем. Вядома, яно ў беларускіх сялян было вельмі адносным. Як вядома, тады толькі на пэўны час хата вяскоўца была поўная хлебам і рознымі прысмакамі. А вось узімку, а тым больш ранняй вясной, сем'ям прыходзілася эканоміць. Таму галоўнай дзейнай асобай, калі можна так сказаць, у абрадзе «Багатыр» з'яўляецца місачка, напоўненая збожжам, у якую ставіцца васковая свечка, часцей за ўсё грамнічная.

Пры гэтым існуе такая асаблівасць — багатыр (свечка) ставіцца толькі адзін на ўсю вёску. Часцей за ўсё ў хаце таго гаспадара, хто хутчэй і (або) больш за ўсіх сабраў ураджаю. У яго хаце з раніцы запальваюць свечкі, служаць набажэнства. Потым місачку са збожжам пераносяць у наступную хату, дзе шэсце сустракаюць гаспадары.

Калі абыходзяць усе хаты, ідуць да чарады кароў, коз. У некаторых мясцовасцях воск на свечку збіралі з усіх хат вёскі. Атрымлівалася яна вялікая і тоўстая. Калі свечка згарае або ўсё, што можна, ужо абышлі, сподачак або збанок са збожжам перадаюць на гадавое захоўванне іншаму гаспадару. Яго ў розных вёсках выбіраюць па-рознаму ў залежнасці ад мясцовых звычаяў.

На думку Вячаслава Смірнова, гэта вельмі цікавы абрад, таму яго тэатралізаваная дэманстрацыя была падтрымана праектам. Як і канцэрт фальклорных калектываў Орлі і навакольных вёсак, арганізацыя кірмашу, дзе ахвотныя маглі набыць сувеніры, паспытаць стравы беларускай нацыянальнай кухні.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

## Бронзавая скульптура Божай Маці будзе адкрыта ў Гродне 14 кастрычніка

Аб гэтым расказаў карэспандэнту **БЕЛТА** аўтар работы гродзенскі скульптар, член Саюза мастакоў Беларусі Уладзімір Панцялееў. Кампазіцыя «Пакроў Прасвятой Багародзіцы» гэтымі днямі ўстаноўлена паблізу Свята-Пакроўскага кафедральнага сабора.

Трохметровая скульптура выліта з бронзы, вышыня кампазіцыі разам з манументам з граніту складае 4,2 м. Цырымонія асвячэння скульптуры адбудзецца ў свята Пакрова Прасвятой Багародзіцы 14 кастрычніка і будзе прымеркавана ў тым ліку да святкавання 110-годдзя Гродзенскай праваслаўнай епархіі.

Манумент узводзіўся ў асноўным на сродкі праваслаўных мецэнатаў.

## Салома ў брыкетах і пілетах эканамічна выгадная

**У Чэрыкаве запрацавала першая ў Магілёўскай вобласці вытворчасць паліўных брыкетаў з саломы.**

Новая польская лінія ўсталяваная на ААТ «Чэрыкаўскі райаграпрамтэхснаб». Яе магутнасць — 1 тона паліўных брыкетаў у гадзіну. Яны цяпер спальваюцца ў спецыяльным аўтаматызаваным катле, які ацяпляе малочны блок прадпрыемства.

— Гэта павеў нашага часу — выкарыстанне мясцовых відаў паліва, — пракаментаваў **начальнік вытворчага аддзела холдынгу ААТ «Аграмашсэрвіс» у Магілёве Міхаіл ІВАНОЎ**. — Салома эфектыўна выкарыстоўваецца, а не гніе на палях, і гэта, вядома, эканамічна выгадна.

Выдаткі на абсталяванне акупяцца праз некалькі гадоў. Мяркуецца, што саламяныя брыкеты будуць прадавацца яшчэ і за межы Беларусі. Спажываць іх у Беларусі пакуль праблематычна, бо няма дастатковай колькасці спецыяльных катлоў, неабходных для такога паліва. Але ўсё ж гэта справа перспектыўная, таму падобная чэрыкаўскай вытворчасць паліўных пілетаў з саломы ў бліжэйшай будучыні запрацуе ў ААТ «Хоцімскі аграпрамтэхснаб».

**Ілона ІВАНОВА.**

Падарожныя нататкі

# КУДЫ ЗНІКЛА СЛАВУТАЯ «РУСАЛАЧКА» З КАПЕНГАГЕНА?

**Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» Глеб Лабадзенка высвятляў гэтую і іншыя акалічнасці ў краіне Андэрсэна**



Від на горад з вежы храма Збаўцы. Злева — Парламент, перад ім з зялёнымі шпілямі — біржа часоў Крысціяна IV, квадратная вежа ў цэнтры — Катэдральны сабор.

### ЛЮДЗЬМІ ЗВАЦЦА

Адвечны комплекс беларусаў «людзьмі звацца» лёгка вырашаецца ў Даніі. Звычайна мы, прыехаўшы куды, кажам, што «Беларусь — маленькая краіна, дзе жыве ўсяго 9,5 мільёна чалавек». Дык вось, плошча Даніі ў 6 разоў меншая за плошчу Беларусі, а людзей тут жыве менш амаль удвая — 5,5 мільёна.

Што вы ведаеце пра Данію? — спытаўся я ў чытачоў свайго блогу www.labadzenka.by перад паездкай. Асацыяцыі былі практычна хрэстаматыйныя — «Андэрсэн», «Русалачка», «Капенгаген», «мушкет», «Гамлет», «браты Лаўдрупы», «свінагадоўля», «карыкатуры на прарока Мухамеда», «Чырвоны Крыж», «неагатычная ратуша», «мастак Хэрлуф Бідструп», «каралі і каралевы», «Скандынавія», «мора», «Цівалі».

Што ж, не так і мала. У Даніі пра Беларусь ведаюць і таго менш (вось яны, перавагі айчыннай адукацыі): Чарнобыль, Лукашэнка, футбаліст Аляксандр Глеб. Хоць у нас ёсць значна больш таго, што маглі б ведаць датчане. Але яны «распіярылі» Андэрсэна на цэлы свет, а ў нас такога таленту, відаць, няма. Хоць беларускія народныя казкі, ці байкі Пане Каханку маглі б заняць годнае месца ў адным шэрагу з казкамі Андэрсэна. Язэп Драздовіч ці Іван Хруцкі — стаць побач з Бідструпам. «Тутэйшыя» — побач з «Гамлетам».

Акрамя таго, у Даніі і Беларусі падобны рэльеф — няма гор, толькі раўніны. Але ў Даніі ёсць мора.

Што да свінагадоўлі, то сітуацыя цікавая: у Даніі жыве 5,5 мільёна чалавек, а свіней у Даніі 17 мільёнаў — прыкладна па тры свінні на аднаго грамадзяніна.



Гендэрная роўнасць у Даніі — не пусты гук, мужчыны з вазочкамі на вуліцах — звыклая справа.

### РУСАЛАЧКА... ПА ВЭБ-КАМЕРЫ!

Вам не перадаць роспач, якая апанавала мяне, калі высветлілася, што сімвал Капенгагена — скульптура «Русалачка» — з'ехала на сусветную выставу ў Шанхай, дзе, дарэчы, ёсць і беларускі павільён.

А на беразе затокі, дзе павінна знаходзіцца Русалачка, усталяваны вялізны экран, на які пастаянна ў рэжыме рэальнага часу транслюецца карцінка з вэб-камеры, якая паказвае Русалачку з Шанхая. Для жыхароў Капенгагена, якія асабліва хвалююцца за лёс мясцовай славутасці, на экране падаецца адрас сайта, дзе Русалачку можна назіраць кругласутачна.

Зразумела, турысты абураюцца: Русалачка ды помнік Андэрсэну — гэта экспанаты, якія візуальна вядомыя многім. Добра, што хоць казачніка пакінулі на месцы.

### САМАЯ ДОЎГАЯ ПЕШАХОДНАЯ ВУЛІЦА Ў ЕЎРОПЕ

Аляксандр Бенуа, які наведаў Данію ў пачатку мінулага стагоддзя, пісаў: «Калі ўжо Стакгольм здолеў так мяне паланіць, то што казаць пра Капенгаген, пра горад непараўнальна больш маляўнічы і кур'ёзны? Асабліва такім ён быў, калі яшчэ захоўваў цалкам сваю ўтульную старасвецкую шляхетнасць, саму атмасферу андэрсэнаўскіх казак. Кожны дом на вузкіх крывых вулачках падаваўся мне нейкім сваяком таго «старога дома», пра які гэтак паэтычна распавядае мой улюбёны пісьменнік, а за іх цьмяна пабліскваючымі шыбамі мроіліся пакойчыкі, дзе на каміне стаяць парцалянавыя пастушка і трубачыст, а стойкі алавяны салдацік уздыхае па балярыне...»

Сёння ў Капенгагене жыве каля 500 тысяч чалавек — у прынцыпе, гэта супастаўна з нашым Гомелем. Капенгаген — вельмі ўтульны, мілы і інтуіцыйна зразумелы горад. Ужо на другі дзень знаходжання тут ты без праблем арыентуешся ў цэнтры і асноўных гісторыка-культурных каштоўнасцях, можаш сам даваць парады толькі прыехаўшым турыстам.



Русалачку я здолеў пабачыць толькі на экране, праз вэб-камеру з Шанхая. Вы гэта таксама можаце зрабіць дома — праз спецыяльны сайт.

Сэнсавы цэнтр старога горада — пешаходная вуліца Строгет. Мясцовыя жыхары з задавальненнем раскажуць вам, што гэта — найдаўжэйшая пешаходная вуліца ў Еўропе. Як і бывае, тут сабраныя сувенірныя крамы у якіх сувеніры традыцыйна даражэйшыя, чым на іншых вуліцах), тут шмат вулічных музыкаў і папулярных у Еўропе «жывых скульптур», калі чалавек увесь фарбуецца, скажам, «пад медзь», і замірае, як скульптура. Кінеш манетку — і «скульптура» ахвотна цябе прывітае.

На Строгеце знаходзіцца старадаўняя аглядная Круглая вежа. Так-так, гэта менавіта тая вежа, якую згадвае Ганс Хрысціян Андэрсэн у некаторых сваіх казках, напрыклад, у «Крэсіве»: «У сабакі вочы — кожнае з Круглую вежу». Як бачым, геніяльны казачнік пабачыў вежу не «ў вышыню», як усе, а «ў разрэзе».

Дыяметр яе сапраўды такі, што верыцца ў апантаны расповед экскурсаводкі, нібыта «наш Пётр І» заехаў сюды на кані, а Кацярына ІІ — нават на карэце. Ты далікатна папраўляеш экскурсаводку, якая пераехала сюды з Піцера, што Пётр І не «наш», а «іх». Экскурсаводка шчыра дзівіцца інфармацыі, што Пётр І, напіўшыся гарэлкі, засек шабляю манахаў у Сафійскім саборы ў Полацку, а потым і ўзарваў храм (паводле афіцыйнай версіі, «парахавы склад» выбухнуў сам). Не менш цікавы для экскурсаводкі і факт, што Кацярыну ІІ хапіў параліч на ўнітазе, які яна зрабіла з трона апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага, які нарадзіўся (гэта ж трэба!) у Камянецкім раёне Беларусі (а не ў «Белоруссии», як упарта кажа экскурсаводка).

Вашы дэбаты перапыняе від фантана, у які нехта, пажартаваўшы, напляскаў вадкага мыла — і фантан стаў шчодра прадукаваць пену, на радасць мясцовым малым ды цікаўным турыстам.

Непадалёк ад фантана стаіць помнік біскупу Абсалону, які ў XII стагоддзі з непрыкметнай вёсачкі зрабіў умацаваны горад, збудаваўшы замак. Біскуп на помніку выяўлены з сякерай у руках: пэўна, ад ворагаў і нядобразычліўцаў ён бараніўся не толькі малітвамі.

### ХРАМ, ЯКІ НЕ ХРАМ

Парламент Даніі знаходзіцца на так званай «урадавай выспе». Гэта — ужо трэці будынак парламента, які стаіць на гэтым месцы: папярэднія два з'елі пажары. Будынак сапраўды грандыёзны, большы за Мірскі замак.




У свеце існуе нават тэрмін «капенганізаванасць» горада, які азначае агромністую колькасць ровараў. Такія ровары з вазочкамі для дзетак — распаўсюджаная рэч у Капенгагене.

Непадалёк — колішнія біржы, якія збудаваў кароль Крысціян IV. Яго ў Даніі вельмі шануюць, бо ён запомніўся менавіта як «кароль-будаўнік», «кароль-стваральнік». Адна з цікавых адметнасцяў будынка — шпілі, якія ўтвораныя з пераплененых хвастоў цмокаў. Такі вось крэатыўны быў кароль.

Датчане жартуюць, што іх Катэдральны сабор больш падобны да палаца ці музея, а культурніцкі цэнтр — да Катэдральнага сабора. Сапраўды, кожны турыст здзівіцца, калі пабачыць прыгажэнны высачэзны храм і даведаецца, што тут... не храм!..

У многіх турыстычных даведніках гэты будынак называецца «храм Святога Мікалая». Але ўсё нашмат цікавей!.. Драўляны храм на гэтым месцы з'явіўся неўзабаве пасля заснавання горада і прастаяў 300 гадоў, пакуль не быў перабудаваны з цэглы ў 1591 годзе. Адметны купал са шпілем гінуў спачатку ў пажары 1628 года, пасля ў пажары 1795 года, калі была знішчаная ўся царква — тады яна і страціла сваю рэлігійную ролю. Сімвалічна, але да 1909 года ў гэтай вежы месцілася... пажарная каманда, выкарыстоўваючы яе як аглядную вышку. Пасля вежай зацікавіўся славуты півавар Якабсэн, стваральнік брэнда «Карлсберг» (пра яго мы яшчэ згадаем) — і адбудаваў храм. Але з нейкай прычыны храмам гэты будынак так зноў і не стаў. Цяпер тут культурніцкі цэнтр, у якім праходзяць выставы сучаснага мастацтва.

### «КАЛІ ХОЧАЦЕ ПРЫДБАЦЬ НАРКОТЫКІ, ТО ВАМ СЮДЫ!

Раён Хрысціянія — адная са славутасцяў Капенгагена. Гэта — абгароджаны з усіх бакоў квартал, дзе з 1971 года жывуць хіпі, якія незаконна пасяліліся тады ў закінутых казармах. Нас загадзя папярэдзілі, што тут нельга фатаграфаваць. І, скажу вам, атмасфера ў Хрысціяніі такая, што фотаапарат даставаць асабліва і не хочацца.

З усіх бакоў чуецца стойкі пах «траўкі», якую можна прыдбаць тут жа, абсалютна ў адкрытую (напрыклад, гашыш). Паколькі Хрысціянія сталася адным з турыстычных пунктаў, вас тут напэўна не крануць — больш за тое, вы нават знойдзеце тут некалькі палатак з сувенірамі — і за адносна невялікія грошы прыдбаеце сабе майку з вясёленькай выявай канаплі.

Гарадскія ўлады перыядычна спрабуюць ваяваць з насельнікамі Хрысціяніі, але была дасягнутая пэўная дамоўленасць, што тутэйшыя персанажы будуць падтрымліваць адносны парадак, не правакаваць канфліктаў, асабліва не буяніць. З таго часу паліцыя сюды практычна не ўваходзіць — толькі часам, калі сітуацыя абвастраецца, здараюцца «зачысткі» з арыштамі. Увогуле ж, Хрысціянія існуе ўжо 38 гадоў адносна мірна, знаходзячыся на частковым самакіраванні. Хоць размовы пры яе ліквідацыю не спыняюцца.

Непадалёк ад Хрысціяніі вас асабліва зацікавіць храм Збаўцы. Ягоны купал выкананы ў выглядзе вінта, па гранях якога можна ўзняцца пешшу на самы верх. Каштуе гэта 25 крон (каля 12 тысяч беларускіх рублёў).

— А гэта не вельмі страшна? — пытаюся я ў хлопца, які прадае квіткі.

— Зусім не страшна! — бадзёра адказвае той. — Я туды падымаюся па некалькі разоў на дзень, каб дапамагчы спусціцца наведнікам, што ўчапіліся ў парэнчы і не могуць расціснуць рукі!..

Сапраўды, адрэналіну вы атрымаеце, нібыта аддалі не 12 тысяч, а ўсе 100 долараў: парэнчы «вінта» не настолькі высокія, каб адчуваць сябе ў поўнай бяспецы. Ды і моцны вецер з блізкага мора не дадае камфорту. Затое ўвесь стары горад — як на далоні. Праўда, калі сутыкаешся з іншымі турыстамі і прыціскаешся да парэнчаў, каб размінуцца, нервы троху казыча...

***(Працяг будзе.)***

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**
**Фота аўтара.**

*Капенгаген.*

**P.S.** *Аўтар шчыра дзякуе МЗС Даніі і Польшчы, а таксама Амбасадзе Польшчы ў Мінску за цудоўна арганізаваную паездку!*




Дацкае піва.

Паспяховае аб'яднанне

# ААТ «Тэхнабанк»: новая стратэгія, новыя магчымасці

**Гэтым летам паспяхова аб'ядналіся два камерцыйныя банкі — ААТ «Беларускі Індустрыяльны банк» і ААТ «Тэхнабанк». Узнікла новая магутная структура з прыватным капіталам, новымі фінансавымі магчымасцямі, сучаснымі банкаўскімі тэхналогіямі, эфектыўнай сістэмай упраўлення і прафесійнай камандай. Новаспечаная фінансавая ўстанова — ААТ «Тэхнабанк» — павялічыла свой капітал, пашырыла кліенцкую базу і на сёння па велічыні актываў займае 15-е месца сярод 30-і банкаў краіны.**

Паводле слоў старшыні Праўлення ААТ «Тэхнабанк» Дзмітрыя МІХАЛЕВІЧА, аб'яднанне — адназначна выгадная рэч, паколькі ў першую чаргу павышае надзейнасць установы. Наогул за гісторыю фінансавай сістэмы краіны зліццё банкаў праводзілася двойчы. У свой час падобную працэдуру паспяхова прайшлі «Белінвестбанк» з «Белбізнэсбанкам» і «Тэхнабанк» з «Гандлёва-прамысловым банкам».

«Тэхнабанк» і «Беларускі Індустрыяльны банк» былі створаныя айчыннымі акцыянерамі — фізічнымі і юрыдычнымі асобамі — у 90-я гады. На момант аб'яднання ўстановы мелі багатую фінансавую практыку, вялізную кліенцкую базу, шэраг банкаўскіх прадуктаў і развітую рэгіянальную сетку. Банкі не толькі выстаялі ў няпростай фінансавай сітуацыі, але значна ўмацавалі свае пазіцыі на рынку, павялічылі актывы і пашырылі пералік банкаўскіх прадуктаў.

Кансалідацыю банкаў падтрымаў Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь, які аператыўна разгледзеў дакументы, правёў належныя кансультацыі і зарэгістраваў новую ўстанову. Захаванне брэнда «Тэхнабанк» не азначала паглынання аднаго банка другім. Рашэнне пра захаванне назвы прынялі самі акцыянеры абодвух банкаў, зыходзячы з эканамічнай мэтазгоднасці. Абодва банкі былі практычна роўнымі па статусе і магчымасцях, аднак на момант зліцця «Тэхнабанк» меў большую кліенцкую базу, пакет ліцэнзій і дагавораў з банкаўскімі сістэмамі іншых краін.

Новы банк максімальна ашчадна паставіўся да праблемы падбору персаналу, адмовіўся ад радыкальных мер па скарачэнні штата. Прафесійнае навучанне персаналу яшчэ працягваецца.

Да міжнароднага ўзроўню бала ўдасканаленая сістэма ўнутранага кантролю і ўпраўлення рызыкамі, аптымізаваная арганізацыйная структура банка, праведзеная мадэрнізацыя сервернага абсталявання і праграмнага забеспячэння, што гарантуе аўтаматызацыю большасці банкаўскіх аперацый на больш высокім узроўні, аператыўнае ўкараненне новых прадуктаў і паслуг. У бліжэйшы час «Тэхнабанк» намераны сфарміраваць адзіную інфармацыйную прастору для больш эфектыўнага ўпраўлення і адэкватнага рэагавання на зменлівыя знешнія ўмовы.

Праз чатыры месяцы пасля аб'яднання заўчасна рабіць глабальныя вынікі і падводзіць істотныя высновы, тым не менш, ААТ «Тэхнабанк» ужо на 12 працэнтаў — да 351 млрд рублёў — павялічыў рэсурсную базу за кошт кліенцкіх сродкаў. Актывы банка выраслі на 9 працэнтаў і склалі 454 млрд рублёў. Крэдытныя ўкладанні ў эканоміку рэспублікі складаюць 196 млрд рублёў, — павялічыліся на 8,7 працэнта.




Старшыня Назіральнага савета ААТ «Тэхнабанк» Уладзіслаў КАЦАРЭНКА і старшыня Праўлення ААТ «Тэхнабанк» Дзмітрый МІХАЛЕВІЧ.

Такім чынам, ААТ «Тэхнабанк» цяпер — гэта:

- аб'яднаны нарматыўны капітал памерам каля 100 млрд рублёў (што адпавядае патрабаванням Нацбанка РБ для дзеючых банкаў, якія маюць права на прыцягненне грашовых сродкаў фізічных асобаў);
- больш як 11 тысяч кліентаў у кліенцкай базе;
- фінансавая палітыка, якая вызначаецца айчыннымі акцыянерамі і кліентамі, а не замежнымі інвестарамі, што забяспечвае свабоду ў прыняцці рашэнняў;
- карэспандэнцкая сетка, якая ўключае банкі-карэспандэнты ЗША, Германіі, Аўстрыі, што забяспечвае высокую хуткасць правядзення плацяжоў;
- шырокі спектр ліцэнзійных паўнамоцтваў на права правядзення банкаўскіх аперацый, уключаючы аперацыі з каштоўнымі металамі, каштоўнымі камянямі і інш.;
- пастаяннае ўдасканаленне ўзроўню сэрвісу;
- эксклюзіўныя банкаўскія паслугі, напрыклад, вяртанне часткі падатку на дабаўлены кошт па чэках TAX FREE, работа з электроннымі грашыма сістэмы WebMoney Transfer;
- паляпшэнне магчымасці ўдзелу ў эканамічным і сацыяльным развіцці Беларусі.

— Банк арыентаваны на абслугоўванне прадпрыемстваў малога і сярэдняга бізнэсу, — кажа спадар Міхалевіч. — Наша мэта — дапамагаць прадпрыемствам, якія з цягам часу стануць апорай нацыянальнай эканомікі. Акцыянеры банка добра разумеюць патрэбы кліентаў і будуюць работу з улікам максімальнага задавальнення іх патрэбаў...

Кліентам «Тэхнабанка» — прадпрыемствам гандлю і сэрвісу, невялікім вытворчасцям, турфірмам і будаўнічым кампаніям — прапануюцца разнастайныя банкаўскія прадукты; імпарцёрам тавараў — канкурэнтныя курсы валют і іх аператыўнае набыццё ў дзень таргоў з мінімальнай камісіяй — ад 0,1 працэнта.

«Тэхнабанк» намераны істотна павялічыць аб'ёмы крэдытавання малога і сярэдняга бізнэсу. Крэдытныя стаўкі застаюцца невысокімі дзякуючы канкурэнтнай тарыфнай палітыцы і якаснаму касаваму абслугоўванню. Такім чынам, банк аддае перавагу таму, каб менш зарабляць на сваіх кліентах, але павялічваць пры гэтым кліенцкую базу. Сёння «Тэхнабанк» прапануе крэдыты ў замежнай валюце — ад 10,5 працэнта гадавых, у беларускіх рублях — ад 14 працэнтаў гадавых.

У пакеце паслуг прапануецца яшчэ адзін «эксклюзіў» — пакет элітнай камерцыйнай нерухомасці ў цэнтры сталіцы, будаўніцтва якой банк крэдытаваў. Нерухомасць прапануецца кліентам у рамках лізінгавых і крэдытных праграм, што з'яўляецца вельмі выгадным.

— Прыярытэтнымі накірункамі нашай стратэгіі з'яўляюцца павышэнне якасці і колькасці паслуг, падтрыманне канкурэнтаздольнасці за кошт гібкай тарыфнай палітыкі, удасканаленне менеджменту і гібкае ўкараненне сучасных банкаўскіх тэхналогій, — тлумачыць Дзмітрый Міхалевіч. — ААТ «Тэхнабанк» распрацаваў Праграму развіцця на 2010—2013 гады, скіраваную на нарошчванне рэсурснай базы і павышэнне надзейнасці банка... За некалькі месяцаў працы аб'яднаны ААТ «Тэхнабанк» дасягнуў сур'ёзнага эканамічнага эфекту, што сведчыць пра рост даверу з боку кліентаў і ўкладчыкаў і пацвярджае правільнасць выбранай акцыянерамі стратэгіі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

Спадчына

## «Я АДЧУВАЮ, ШТО ЗНАХОДЖУСЯ НА РОДНАЙ ЗЯМЛІ»

**Так сказаў прапрапрапраўнук Міхала Клеафаса Агінскага, кампазітар і піяніст з Вялікабрытаніі Іва Залускі, звяртаючыся ў Гродне да ўдзельнікаў міжнароднай навуковай канферэнцыі «Адбіткі дзяржаўнай і культурнай дзейнасці князёў Агінскіх».**

Канферэнцыя прайшла ў Новым замку ў межах Міжнароднай адукацыйна-канцэртнай праграмы «Шлях паланэзаў Міхала Клеафаса Агінскага-2010», прысвечанай 245-й гадавіне нараджэння палітыка, дыпламата і кампазітара. Яе арганізавалі Інстытут гісторыі Літвы, музей гісторыі культуры роду Агінскіх (г. Рэватас, Літва), ГрДУ імя Янкі Купалы і Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей.

— Для мяне вялікая адказнасць — прадстаўляць род Агінскіх, і я з вялікай павагай стаўлюся да трох краін — Беларусі, Літвы і Польшчы, на тэрыторыі якіх знаходзілася радзіма маіх продкаў. Гэта незалежныя дзяржавы, але, мяркую, іх аб'ядноўваюць у тым ліку і традыцыі Агінскіх, — зазначыў Іва Залускі.

Суседзі

## МОЎНАЯ ПАДТРЫМКА ДЛЯ ПАМЕЖНЫХ СУВЯЗЯЎ

**У Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы адкрыўся Цэнтр літоўскай мовы і культуры, паслугамі якога змогуць карыстацца не толькі студэнты і выкладчыкі, але і ўсе ахвотныя.**

Цэнтр дапаможа не толькі ў вывучэнні літоўскай мовы, але і ў інфармаванні па пытаннях эканомікі, культуры, турызму суседняй краіны. Дарэчы, 16 студэнтаў ГрДУ прайшлі навучанне ў Інстытуце літоўскай мовы ў Вільнюсе. З гэтага года літоўскую мову ў ГрДУ вывучаюць студэнты-філолагі, а таксама на факультэце турызму і сэрвісу. Пакуль гэта робіцца ў рамках курсаў дзякуючы выкладчыкам, якія прыязджаюць з Друскінінкая. А ў перспектыве на некаторых спецыяльнасцях філфака плануецца вывучэнне літоўскай мовы як другой замежнай.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

Международный Резервный Банк
220075, г. Минск, пер. Промышленный, 11
тел./факс: (017) 299 69 00, тел. (017) 299 69 02
e-mail: info@irb.by

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2010 г.**
ОАО «Международный резервный банк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 01 октября 2010 г. | 01 октября 2009 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 850,5 | 1 012,5 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | | 4 605,7 | 176,9 |
| 4 | Ценные бумаги | 1103 | | | – |
| | для торговли | 11031 | | | – |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | | – | – |
| | в наличии для продажи | 11033 | | – | – |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | | 1 394,3 | 11 411,6 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | | 9 123,7 | 3 883,9 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | | 0,0 | – |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | | 918,0 | 958,1 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | | 1 774,3 | 2 226,0 |
| **10** | **ИТОГО активы** | **110** | | **18 666,5** | **19 669,0** |
| 11 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | | – | – |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | | | 15,0 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | | 1 014,7 | 730,8 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | | – | – |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | | 388,5 | 1 512,7 |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 1 403,2 | 2 258,5 |
| 18 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | | 16 137,8 | 16 137,8 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | | – | – |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | | 313,8 | 280,6 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | | 745,5 | 979,7 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | | 66,2 | 12,4 |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | | 17 263,3 | 17 410,5 |
| **25** | **ИТОГО обязательства и капитал** | **12** | | **18 666,5** | **19 669,0** |
| 26 | **ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ** | | | | |
| 27 | Требования | 1301 | | 27 431,8 | 40 587,5 |
| 28 | Обязательства | 1302 | | 27 075,6 | 40 777,3 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2010 г.**
ОАО «Международный резервный банк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 01 октября 2010 г. | 01 октября 2009 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 1 234,2 | 2 038,9 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 24,4 | 110,1 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 1 209,8 | 1 928,8 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 3 753,5 | 557,1 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 244,6 | 40,5 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 3 508,9 | 516,6 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | | 613,3 | 846,1 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 274,4 | - |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | | - | - |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | | 346,7 | 119,2 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | | 209,5 | 450,7 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | | 3 932,9 | 2 854,8 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | | 1 536,0 | 426,9 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | | 0,0 | 57,1 |
| **15** | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | | **0,3** | **284,2** |

**И.о. Председателя Правления** **А.Е. Добровольский**
**Главный бухгалтер** **С.С. Ящук**
**Дата подписания 08 октября 2010 г.**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 26 от 01.01.2010 г.
Кор/счет 3200007350013 в РЦ НБ РБ, МФО 153001735. УНП 807000043.

Футбол. ЧЕ-2012

# Футбольны цуд ад Бернда Штанге пад пытаннем?


Фота Пятра ФАМІНА.

**ПРА ГЭТА можна даведацца ўжо сёння позна ўвечары, калі на сталічным стадыёне «Дынама» нацыянальная зборная Беларусі правядзе апошні ў гэтым годзе адборачны матч да чэмпіянату Еўропы-2012. Сапернікам беларусам стануць албанцы — каманда гэтай краіны заўсёды вызначаецца непрадказальнасцю і мае статус «цвёрдага арэшка».**

Сцвярджаць, што любы вынік, акрамя выйгрышу, стане для падначаленых спадара Штанге правальным, наўрад ці можна. І ўсё з-за сенсацыйнай стартавай перамогі над французамі ў Парыжы, дзякуючы якой нямецкі трэнер атрымаў значны карт-бланш не толькі ад кіраўніцтва Беларускай федэрацыі футбола, але і звычайных балельшчыкаў. Хоць мяркуючы па ўчарашняй прэс-канферэнцыі, якая ў сваёй большасці падводзіла вынікі пятнічнай малавыразнай выязной гульні з Люксембургам (0:0), у выпадку чаго крэдыт даверу да замежнага настаўніка і ігракоў «нацыяналкі» зноў можа вярнуцца да «плінтусавага» ўзроўню.

Сустрэчу з журналістамі Бернд Штанге пачаў у якасці форварда, спрабуючы адразу ўзяць ініцыятыву ў свае рукі і не даць прадстаўнікам айчынных СМІ раздуць з мухі слана. Сёння я без ігракоў нацыянальнай зборнай, засяродзіў увагу прысутных германскі коўч. Калі каманда выйграе, падкрэсліў ён, то я заўсёды прыходжу з футбалістамі. Калі ж гуляе няўдала, то прымаю ўвесь агонь крытыкі на сябе — чыталася на твары нямецкага настаўніка.

Аналізуючы нулявы зыход паядынку ў Люксембургу, Бернд Штанге без залішніх ваганняў прызнаўся, што для беларусаў гэта была няўдалая гульня. І не толькі з пункту гледжання нулёў на табло, але і з пазіцыі гульнявога майстэрства і тактыкі. Галоўнай памылкай у гэтым паядынку з футбалістамі карлікавай еўрапейскай краіны, сказаў спадар Штанге, былі высокія перадачы, якія раз за разам станавіліся лёгкай здабычай гаспадароў поля. Акрамя таго, у радах зборнай не знайшлося футбаліста, які здолей бы аддаць пару-тройку пасоў, якія б вянчалі галявы момант з абавязковым узяццем варот саперніка. А ў беларускай камандзе, калі верыць нямецкаму трэнеру, роля «інтэлігентаў» адводзілася Аляксандру Глебу і Віталю Кутузаву. Але ж па волі абставін гэтыя ігракі ў Люксембургу не выступалі. Зараз, працягнуў галоўны трэнер беларускай зборнай, мы маем поўную аналітычную выкладку з апошняга матча і супраць албанцаў павінны выступіць агульным фронтам. І неабавязкова па схеме з двума апорнымі абаронцамі, дзеля таго, каб выйграць сённяшнюю сустрэчу і пайсці на зімовыя канікулы на другой пазіцыі. Тут ужо спадар Штанге ўлічыў патэнцыйную перамогу зборнай Францыі, якая сёння дома прымае каманду Люксембурга. З улікам суботняга выйгрышу на «Стад дэ Франс» над румынамі з лікам 2:0 падначаленыя Ларана Блана могуць ісці на «зімоўку» аднаасобнымі лідарамі з трыма вікторыямі запар.

Рэзюме ўчарашняй прэс-канферэнцыі Бернда Штанге было прадказальным: нам неабходна толькі перамога і іншага выніку мы сабе не ўяўляем. Праўда, якімі метадамі яна будзе здабытая і хто выступіць у ролі галоўных «скрыпачоў», сказана не было. Заўтра, г.зн. сёння, убачыце, сказаў Бернд Штанге. Адно магу сцвярджаць, заключыў ён, што гульнявы склад у параўнанні з папярэднім матчам, практычна не зменіцца. А тактыку гульні неабходна скарэктаваць: футбалісты павінны будуць менш біць верхам, а гуляць нізам. У гэтым выпадку лягчэй будзе паказаць сваё майстэрства Сяргею Кісляку, Антону Пуцілу, Віталю Радзівонаву. Мы не павінны расчараваць беларускіх балельшчыкаў у кваліфікацыйным турніры, які пачалі з феерычнай перамогі над чэмпіёнамі свету. Без сумненняў, падвёў рысу галоўны трэнер беларусаў, гульня будзе цяжкай, але выйграваць мы павінны, бо пры ўсёй павазе да албанцаў, па класе яны ніжэй за французаў, румын і нават баснійцаў.

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ.**

## АВАРЫЯМ СПРЫЯЕ ЦЕМРА

Вадзіцель легкавушкі з горада Мікашэвічы не разгледзеў у цемры падводу, якая не была абазначана святлоадбівальнымі элементамі, і дапусціў сутыкненне. У выніку кіроўца падводы, 61-гадовы жыхар вёскі Сітніца, трапіў у бальніцу з сур'ёзнымі траўмамі.

**Яна СВЕТАВА.**

Утерянные представительством Белгосстраха по Ленинскому району **бланки страховых полисов** по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу **формы 2РНП серии БЛ №№ 0779973—0779974 считать недействительными**. *УНП 101883943*

**Государственному предприятию «Экспериментальная база «Ганусово» Несвижского района Минской области**
**НА ПОСТОЯННУЮ РАБОТУ ТРЕБУЮТСЯ:**

- **ЗООИНЖЕНЕР со стажем работы не менее 5-ти лет (оплата согласно штатного расписания);**
- **ОПЕРАТОРЫ МАШИННОГО ДОЕНИЯ;**
- **МЕХАНИЗАТОРЫ.**

Оплата труда 1–2,5 миллиона и выше в зависимости от трудового вклада. Предоставляется благоустроенное жилье, в пригороде и в городе Несвиже.

**Адрес: г. Несвиж, ул. Пригородная, 1.**

**Тел.: 8 029 703 54 24, 8 01770 64 1 24, 8 01770 64 2 47.**

УНП 600031409 Администрация.

22 октября 2010 г. в 16.30
**СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «ЧЕРНАВЧИЦКИЙ ЗАВОД ЖБИ»**
Повестка дня:
1. О приобретении обществом акций собственного выпуска на баланс общества.
Собрание будет проходить по адресу: Брестский р-н, д. Чернавчицы, ул. Трудовая, 1Г.
Начало регистрации участников собрания: 16.00. *УНП 200034706*

22 октября 2010 г. в 12.30
**состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Универсам «Северный»**
Повестка дня:
1. О совершении сделок общества.
2. О перевыборах членов совета директоров общества.
Собрание будет проходить по адресу: г. Минск, ул. Мирошниченко, 3.
Начало регистрации участников собрания: 12.00. *УНП 100356386*

Надта інтымна

# УДАР НІЖЭЙ ПОЯСА, або Што забівае сэкс?



**Знаўцы кажуць, што кожнай пары, тым больш шлюбнай, наканавана зведаць сэксуальную дысгармонію. «Жоўтыя» крыніцы інфармацыі кормяць чытача рознымі байкамі на гэту тэму, але большасць парад адносна таго «як застацца шчаслівым у сэксе forever» надта далёкія ад рэальнага жыцця.**
**Аб тым, што парушае сэксуальную гармонію і што здольна яе аднавіць, расказвае ўрач-сэксолаг Мінскага абласнога псіханеўралагічнага дыспансэра Дзмітрый КАПУСЦІН.**

***— Дзмітрый Зіноўевіч, чаму на пачатку адносінаў усё бывае такім патэнцыйна аптымістычным, а праз нейкі час — ні аптымізму, ні патэнцыі? Навошта мы ўступаем у шлюб, калі ён забівае ўсё самае цікавае дашлюбнае?***

— Гэта пытанне нумар адзін — матывацыя пры ўступленні ў шлюб. Сэксуальныя дысгармоніі ва многім закладваюцца менавіта ў момант стварэння шлюбнага саюза. Пры абмеркаванні праблемы дысгармоніі ў сэксе я пытаюся ў пацыентак, чаму яны выйшлі замуж менавіта за гэтага чалавека, чым ён уразіў? У адказ звычайна чую: зацяжарала, узрост падышоў, сябры раілі або яшчэ лепш — а больш не было прэтэндэнтаў, дзякуй, што гэты прапанаваў.

Другі важны момант. Калі жанчына апісвае вартасці, якія ёй падабаліся ў партнёры, — гэта звычайна досыць сціплы пералік, а калі размова заходзіць аб тым, што ёй хацелася б змяніць у сваім мужчыне, дык гэты спіс можа быць у разы даўжэйшым. Шэраг жанчын ідуць у шлюб з думкай, што зробяць з каменя алмаз. Гэта вельмі вялікая памылка.

Трэці момант. Нават калі жанчына бачыць у сваім партнёры шэраг станоўчых момантаў — не п'е, не курыць, добра зарабляе, ёсць перспектывы росту, любіць і г.д., яна можа забывацца паставіць перад сабой яшчэ адно важкае пытанне: а што асабіста я адчуваю ў дачыненні да гэтага мужчыны? Платанічнае пачуццё абавязкова нараджаецца з пасылу «мне з ім цікава», «мне хочацца яго ўбачыць». Але праз нейкі час павінна з'явіцца і патрэба ў ласках, дотыку. Жанчына павінна жадаць абдымкаў, марыць аб пацалунках... Абуджэнне эратычнага лібіда сведчыць аб тым, што нешта можа атрымацца. Вось яна, аснова для шлюбу.

***— А выпрабоўваць партнёра ў сэксе да шлюбу трэба?***

— Гэта зусім не гарантыя будучай гармоніі. Нейкія сур'ёзныя паталогіі сустракаюцца ўсё ж такі рэдка. Таму што там правяраць!? Хоць большасць разважае прыкладна так: давай паспрабуем, ці спадабаецца... Дарэчы, мужчыны, якія знаёмяцца на сайтах, на першым спатканні разглядваюць жанчын як тавар. Маўляў, ну-ка, пакруціся... Ага, добра, пайшлі да мяне, пакажаш, на што ты здольная: спадабаецца — можа, будзем сустракацца. Што характэрна, 6-7 дзяўчат з дзесяці ідуць не раздумваючы...

***— Мне здаецца, якімі б правільнымі ні былі матывацыі і выпрабаванні да шлюбу, сэксуальная дысгармонія можа заявіць аб сабе літаральна ў самым пачатку сумеснага жыцця...***

— Бо пачалася звычайная прыцірка, якая доўжыцца ў сярэднім на працягу года. Калі за гэты час пара не разбягаецца, значыць, партнёраў нешта трымае, і, зноў жа, ёсць падставы разлічваць на нейкую трываласць саюза ў будучым.

У сямейным жыцці бакі высвятляюць для сябе шэраг новых нюансаў аб партнёры. У мяне быў такі выпадак. Пацыентка сем гадоў пражыла ў грамадзянскім шлюбе. Партнёр настаяў на тым, каб яны стварылі сям'ю. Праз месяц пасля роспісу яна зацяжарала, а праз чатыры прыйшла да мяне з праблемай: хачу развесціся! Як жа так? — пытаюся. «Толькі цяпер, калі я зацяжарала, зразумела, што ён... ідыёт!».

Уступаючы ў шлюбныя адносіны, мы, папершае, нечага адзін ад аднаго чакаем, а, па-другое, часам самі нават не ведаем, якой будзе наша рэакцыя на тое, што мы будзем адкрываць у нашым партнёры. Усё ж такі жыць разам пачалі абсалютна розныя людзі — з рознымі ўстаноўкамі, розным выхаваннем, розным сэксуальным вопытам. З двух асобных сцэнарыяў трэба напісаць адзін, агульны. Кожнаму пры гэтым ад нечага давядзецца адмовіцца, а штосьці дадаць...

> ***Сэксуальная гармонія можа знікнуць як з-за аднастайнасці, так і з-за любых змен, нават не звязаных з інтымным жыццём.***

Вось вам сітуацыя. Муж прыходзіць да жонкі з прапановай: усе кажуць, што вось гэта нічога, — давай паспрабуем... Яна: не хачу, гэта цяжка, брыдка і г.д. Ён, вядома, можа сказаць: ладна, давай па-стандартнаму, як раней. Але ж для яго гэта «прапанова» можа быць важнай. І калі так, то думка, якая зарадзілася, нікуды не знікне. Жонцы застаецца думаць, як хутка і з кім муж захоча рэалізаваць сваю фантазію... Наогул мудрая жанчына ведае: манатоннасць забівае цікаўнасць. З аднаго боку, сэксуальнае жыццё трэба проста падтрымліваць, яно павінна быць рэгулярным, стабільным, з другога, — толькі не аднастайным. Бывае ж так: жонка прыгажуня, разумніца, а ён знайшоў сабе на баку штосьці шэранькае. Навакольныя здзіўляюцца: ну, не дурань? Але ж гэта шэранькае — нешта новае. Без элементу навізны мужчынская сэксуальнасць затухае.

***— Было б зразумела, калі б гэтае затуханне пачыналася гадоў праз дваццаць сумеснага жыцця, але ж, наколькі я разумею, манатоннасці трэба пазбягаць з першых шлюбных дзён?***

— Як ні крыўдна гэта вымаўляць, затуханне сэксуальнай функцыі ў мужчын пачынаецца дзесьці пасля 25-27 гадоў, а пасля 40 гадоў мы цвёрдым крокам ідзём «з кірмашу».

Французы ў прынцыпе кажуць, што да 30-32 гадоў мужчына галоўны ў сэксе, задае мелодыю. Жанчына ж падладжваецца. Праўда, калі ён пры гэтым не прыслухоўваецца да таго, як адгукаецца яго мелодыя ў партнёрцы, то гэта, зноў жа — дысгармонія.

Пасля 30-35 гадоў мужчына яшчэ можа нейкі час «плыць па цячэнні», але мудрая жанчына павінна перахапіць ініцыятыву і павесці мужа за сабой — пачаць спакушаць яго бялізнай, касметыкай, харчаваннем, паводзінамі... Павінна быць пастаянна новай, але пры гэтым добра разумець, што яму трэба. Калі для мужчыны сэкс важны, а жонка гэта ігнаруе, то пасля 40 гадоў мужа павядзе за сабой іншая жанчына.

***— Для жанчыны сэкс можа быць настолькі важным як для мужчыны?***

— Ад жанчыны, для якой сэкс выходзіць на першае месца, збяжыць любы мужчына. Ён будзе занепакоены адным пытаннем: а раптам я не змагу? У маёй практыцы былі рэдкія выпадкі, калі такія жонкі прыходзілі з мужамі і скардзіліся, маўляў, я яму і паказваю, і расказваю... Доктар, ну скажыце ж вы яму! А той муж сядзіць і думае: во трапіў...

***— А што мужчыну вымушае ўзяць шлюб?***

— Для моцнага полу сэкс — нармальная матывацыя. У прынцыпе, для мужчыны сэкс павінен стаяць не далей за 2-3 месца ў спісе 6-7 асноўных прычын жадання быць разам з жанчынай. За выключэннем ранняга юнацтва, калі сэкс адназначна займае першае месца. Калі мужчына жэніцца на добрай чэкавай кніжцы, значыць, будуць праблемы. Сэкс для мужчыны ўсё роўна важны, а ад колькасці грошай, зробленых партнёркай, ніводзін не здольны ўзбудзіцца.

***— Што ж патрэбна моцнаму полу?***

— Эратычны аб'ект. За 11 секунд ён аглядае спераду грудзі, талію, клубы, ногі, твар, ззаду — талію і ягадзіцы, пасля чаго становіцца зразумелым, ці заслугоўвае аб'ект далейшай увагі. Знешнасць для мужчыны з'яўляецца вядучай у сэксе. Моцны пол падкі на цела. Але ж, на вялікі жаль, гэта цела не кладзецца ў ложак па першым патрабаванні! Таму ёсць два варыянты: аблізнуцца і сказаць сабе «не надта і хацелася» або «куды мне — лысаму ды з маёй патэнцыяй...». Або думаць, як заваяваць...

Чым больш упэўнены ў сабе мужчына, чым больш ён цэніць сябе, чым больш прывабна выглядае, чым больш перамог над жанчынамі ён атрымаў, тым лягчэй яму даецца практыка заваявання. Але, на жаль, такія, як правіла, ужо не спыняюцца. Рэдкі прыгажун-«разведчык» усведамляе, што яму пашанцавала з жонкай і пачынае ігнараваць бясконцую колькасць іншых целаў. Каб спыніцца, патрэбныя неверагодныя маральныя ўстаноўкі, трэба, каб станавілася брыдка ад думкі, што прылегчы вось з гэтай дзяўчынай не праблема, бо гэта — цела, а дома — не толькі цела, але і Асоба...



Між іншым, многія жонкі дарэмна крыўдзяцца на мужоў, якія разглядваюць іншых жанчын, адзначаюць, у каго лепшыя ягадзіцы. Мужчыну можа цалкам задавальняць тое, што ў яго ёсць, але заплюшчыць вочы ён не ў стане.

***— Цудоўная падстава для дысгармоніі...***

— Так, падстаў для дысгармоніі — безліч.

> ***Гармонія ў палавым жыцці залежыць ад умення прыстасаваць уласныя сэксуальныя патрэбы да патрэбаў партнёра.***

Тут не можа быць ніякіх агульных залатых рэцэптаў і правілаў. Пахіснуць сэксуальную гармонію можа любая акалічнасць. І не абавязкова гэта будзе здрада... Дапусцім, муж добра зарабляў, і раптам пачаў прыносіць менш. Часам нават цяжка дакладна сказаць, што першаснае: праблемы з сэксам вылiліся ў праблемы з фінансамі ці наадварот?

І для мужчыны, і для жанчыны могуць быць важнымі нюансы, не звязаныя напрамую з сэксам. Напрыклад, партнёр перастаў сачыць за сабой, захварэў, падвёў сяброў... Гэта паўплывае на сэксуальныя адносіны партнёркі? Можа, вельмі моцна, а можа, гэта скажацца праз некалькі гадоў. Адзін пацыент гаварыў, што ўсё жыццё шукаў ідэал — 90-60-90, з-за чаго жаніўся толькі ў 30 гадоў. Глядзеў на выбранніцу і сам сабе зайздросціў. Хто куды бег пасля работы, а ён дадому. Прычым сапраўды пашанцавала: не толькі цела выдатнае, але і чалавек аказаўся добры. Аднак пасля нараджэння другога дзіцяці адбыўся нейкі збой у арганізме, і 90-60-90 ператварыліся ў 136 кг. А ён візуаліст, сэкс стаў практычна немагчымым. Аднойчы жонка яму сказала: знайдзі сабе жанчыну, маўляў, каб ты не пасталеў заўчасна. Разумная жанчына: ведала, што мужчына, які не эякулюе, хутчэй сталее. Гадоў дзесяць пасля такога дазволу ён нават думаць не хацеў пра здраду. Потым выпадкова пазнаёміўся з маладой дзяўчынай. Сувязь працягвалася два гады. Палюбоўніцы было далёка да жонкі. Акрамя таго, яму стала цяжка ўсведамляць, што ад яго чакаюць толькі сэксу... Словам, сям'я захавалася. Калі мы гаворым пра гармонію, то маем на ўвазе давер. Як бы ні паступіў наш партнёр па шлюбе, мы павінны падтрымаць яго.

***— Значыць, праблемы пачынаюцца тады, калі няма даверу?***

— Давер — паняцце шырокае. Прасцей сказаць, важна, ці задаволеныя мы тым, што маем. Скажам, існуе паняцце палавой канстытуцыі. Яна вызначае патрэбу і здольнасць здзяйсняць палавыя акты. У аднаго гэта можа быць раз у 2-3 гадзіны, а ў іншага — раз у 3-5 дзён. І тут немагчымая ніякая карэкцыя, бо адразу ж узнікне незадаволенасць, а значыць, і дысгармонія. Патрэбная адпаведнасць.

***— Гэту адпаведнасць можна як-небудзь разгледзець яшчэ да сэксу?***

— Тут ёсць прамая сувязь з тэмпераментам. Калі мы не падыходзім адно аднаму па тэмпераменце, то ёсць высокая верагоднасць, што і ў сэксуальным сэнсе мы не дасягнем узаемаразумення.

***— Мужчыны кажуць: пасля трэцяй чаркі ўсе жанчыны — прыгажуні (падыходзяць, значыць, для сэксу). Аднак жанчыны нечага падобнага пра мужчын сказаць не могуць... Малавата мужчын, цікавых з сэксуальнага пункта гледжання...***

— Важную ролю ў фарміраванні мужчыны іграе бацька. А ў нашых сем'ях, як вядома, татаў часцяком няма побач. Выхаванне ж хлопчыка без бацькі або з бацькам, не здольным паказаць добры прыклад мужчынскіх паводзінаў, пагражае трансфармацыяй палавой ролі. Такі мужчына будзе або агрэсіўным, або падатлівым, не здольным узяць на сябе адказнасць, а значыць, не стане актыўным «разведчыкам». Гэтым мужчынам, дарэчы, дастаюцца актыўныя жанчыны. Пры гарманічным раскладзе даганяць самку, прымаць рашэнне павінен самец. Слабы самец ні за кім не ганяецца. Яго даганяе актыўная самка. Аднойчы моцным самкам хочацца адпачыць і перакласці груз на плечы мужчыны. Але ж не тут было.

***— Пячатка ў пашпарце, здаецца, усё ўскладняе. А, можа, у так званым грамадзянскім шлюбе дысгармоній менш?***

— У прынцыпе, менш. Сужыцельства дазваляе выпрабаваць псіхалагічную і сэксуальную сумяшчальнасць, у такой сітуацыі прасцей разысціся. Сапраўды, такім чынам пара дамаўляецца, што будзе жыць разам, пакуль абодвух усё задавальняе. Калі што, можна бяскроўна развітацца на наступны дзень. А шлюб — гэта ўкладанні ў агульны кацёл, і нярэдка пры гэтым аказваецца, што развітацца фактычна немагчыма. Адна пацыентка неяк скардзілася на мужа: і п'е, і гуляе, і на ганарэю захварэў. Я прапаную выйсце: разысціся. Яна: дык у мяне ж ні кватэры, ні працы, ні грошай...

Нягледзячы на вялікую колькасць разводаў, шлюб усё роўна застаецца досыць трывалай формай суіснавання двух людзей. Пры заключэнні шлюбу мы тым самым даём адно аднаму зразумець, што хочам быць разам і, калі што, — прытрымся. Паскандалім, але памірымся.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# Што Дзень «нямецкі» нам рыхтуе?

**Па першае, ён стане працягам традыцыі праводзіць восенню Дні нямецкай эканомікі ў Беларусі. Па другое, дасць магчымасць больш шырока задзейнічаць досвед Германіі як сусветнага лідара ў сферы энергаэфектыўнасці.**

Вось з гэтай нагоды 13 кастрычніка пройдзе такі чарговы Дзень. Яго арганізатарамі зноў выступілі прадстаўніцтва нямецкай эканомікі ў Беларусі і нямецка-беларускі эканамічны клуб. У Мінск прыедзе прадстаўнічая дэлегацыя дзелавых колаў ФРГ. Яе візіт адобраны бундэстагам і падтрыманы Федэральным міністэрствам эканомікі і тэхналогій Германіі. У склад дэлегацыі ўвайшлі амаль 30 чалавек: як менеджары сусветна вядомых нямецкіх фірмаў, так і прадстаўнікі сярэдняга і малога бізнэсу, якія маюць намер пашырыць свае дзелавыя інтарэсы ў Беларусі. Вядома, у сферы энергаэфектыўнасці і выкарыстанні аднаўляльных крыніц энергіі. Разам з бізнэсменамі наведае нашу краіну і дэпутат бундэстага Роберт Хохбаум, які пазнаёміць сваіх суразмоўцаў з ажыццяўленнем на дзяржаўным узроўні энергетычнай палітыкі ў ФРГ.

Гасцям будзе прапанаваная шырокая праграма, галоўнымі пунктамі якой абяцаюць стаць удзел у кантактна-кааперацыйнай біржы, наведванне шэрагу беларускіх прадпрыемстваў, перамовы з патэнцыйнымі партнёрамі. Арганізатары візіту таксама разлічваюць на плённы ўдзел членаў дэлегацыі ў XV Беларускім энергетычным і экалагічным форуме.

Чым нам можа быць карысным досвед ФРГ у сферы энергаэфектыўнасці? Ды па многіх пазіцыях. Доля Германіі ў сегменце сусветнага рынку альтэрнатыўнай энергетыкі складае каля 20 працэнтаў. Больш таго, у сваёй энергетычнай канцэпцыі ФРГ зрабіла стаўку на выкарыстанне альтэрнатыўных і аднаўляльных крыніц энергіі. На думку спецыялістаў, ёсць вялікі патэнцыял для рэалізацыі нямецка-беларускіх праектаў у гэтай сферы. Бо ў новай энергетычнай канцэпцыі Беларусі вялікая ўвага надаецца альтэрнатыўным і аднаўляльным крыніцам энергіі, у прыватнасці, прадугледжваецца да 2020 года за іх кошт забяспечыць 32 працэнты энергаспажывання краіны.

Як адзначыў у размове з журналістамі старшыня нямецка-беларускага эканамічнага клуба Клаўс Баер, ні адна краіна не можа вырашыць праблемы энергетыкі і экалогіі самастойна. Аднак, на яго думку, Германіі ёсць што прапанаваць іншым краінам у гэтай сферы. Па словах кіраўніка прадстаўніцтва нямецкай эканомікі ў Беларусі Уладзіміра Аўгусцінскага, ФРГ з'яўляецца сусветным лідарам у сучаснай энергетыцы, у тым ліку і па выкарыстанні аднаўляльных крыніц энергіі і павышэнні энергаэфектыўнасці. Ужо ёсць праект аб стварэнні з нямецкімі партнёрамі парка ветракоў у Дзяржынскім раёне. Пад яго прадугледжваюцца інвестыцыі 250 мільёнаў еўра.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

КІРМАШ — штотыднёвы рэкламны выпуск № 30 (651)
аддзел рэкламы ☎ 287 17 79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

*ПРАДАЕЦЦА*

❒ Трактар Т-25 с прычэпам «Зубраня», з дакументамі.
Тэл.: 8 015 96 23 000, 8 029 759 70 71.

❒ А/м ВАЗ-2101, 1977 г.в. у добрым рабочым стане. У дадатак запчасткі. Чырвоны, бензін. Торг. Тэл. у Мінску 296 40 28, МТС 756 60 54.

❒ А/м «Вольва-440», 1990 г.в., 1,7 бензін. Мінск.
Тэл. 8 029 121 20 77.

❒ А/м «Форд-Арыён», 1991 г.в., 1,4 бензін.
Тэл. 8 029 871 60 99

❒ Каляска інвалідная з электрапрывадам.
Тэл. 8 044 754 06 65.

❒ Драўляны дом з усімі выгодамі, новы ў г. Лельчыцы Гомельскай вобл.
Тэл.: 8 0235650157, 8 029 669 76 18.

❒ Станок дрэваапрацоўчы «УБДН-6М» («Разумнік»), 220 В, 1 квт, 60 кг, 8 аперацый, пераносны, новы.
Тэл. 8 029 189 77 10.

*КУПЛЮ*

❒ Трактар МТЗ-82, можна з пагрузчыкам ці экскаватарам.
Тэл. 8 044 473 68 90.

*РОЗНАЕ*

❒ Кансультацыя: навуковыя матэматычныя работы вучняў.
Тэл. 8 029 857 58 51.

ЗВЯЗДА

**КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ**
**Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі:**
**220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.**

**АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.**

Пашпарт, серыя______ №__________ Выдадзены ______________________

Подпіс ______________ Дата ________

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА 10.11.2010 в 11.00**
**по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Горького, 87 А, каб. № 204 по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества сроком на три года для использования в целях размещения офисов, магазинов, производственных площадей (за исключением вредных производств), оказания услуг по бытовому обслуживанию населения**

| Организатор аукциона | РУП «Белтелеком» в лице Гродненского филиала, 230015, г. Гродно, ул. Горького, 87 А. | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Номер лота | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| Местонахождение имущества | г. Гродно, ул. Пестрака, 36, здание АТС. | Гродненская обл., г. Лида, ул. Чапаева, 3, здание АТС. | | Гродненская обл., г. Лида, ул. Тельмана, 10, здание РУЭС. | |
| Характеристика имущества, входящего в состав лота | Часть помещения на 5-м этаже. Имеется естественное освещение, электроснабжение, центральное отопление, телефонизировано. Требуется проведения дополнительных работ по разграничению арендуемого помещения | Отдельные помещения на 4-м этаже. Имеется естественное освещение, центральное отопление, канализация, электроснабжение, телефонизировано. Помещения требуют перепланировки, реконструкции и ремонта, этажи имеют высоту около 5 метров на три лестничных пролёта, высота 4-го этажа соответствует 7-му этажу в обычном здании, лифт отсутствует, необходимо отгораживать часть территории на земельном участке от территории РУП «Белтелеком» для свободного прохода посторонних посетителей. | Отдельные помещения на 1-м этаже. Имеется естественное освещение, центральное отопление, электроснабжение, телефонизировано. | Отдельные помещения на 1-м этаже. Имеется естественное освещение, центральное отопление, электроснабжение, телефонизировано. В помещении отсутствует водоснабжение, канализация, санузел находится на улице. | |
| Площадь имущества, кв.м | 212,0 | 320,29 (274,89 + 2,2 + 1,5 + 6,9 + 27,0 + 7,8) | 80,4 (64,6 + 15,8) | 23,2 (11,1+12,1) | 16,9 |
| Коэффициент от 0,5 до 3,0 | 2,5* | 2,5* | 3,0 | 2,5* | 2,5* |
| Начальная цена, руб. | 1 855 000 | 2 802 540 | 703 500 | 203 000 | 147 875 |
| Размер задатка, руб. | 185 500 | 280 254 | 70 350 | 20 300 | 14 788 |

* – При наличии более 2 участников аукциона коэффициент увеличивается на 0,5.

Порядок проведения и оформления участия в аукционе определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору следующие документы: заявление на участие в аукционе, заявление об ознакомлении с документами, порядком проведения аукциона, соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, копию платежного документа о перечислении задатка, документ, удостоверяющий личность (для физических лиц, для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) (для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), копию свидетельства о государственной регистрации (для индивидуальных предпринимателей и юридических лиц резидентов Республики Беларусь), легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения (для юридических лиц нерезидентов Республики Беларусь). Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Задаток перечисляется на субсчет 3012000000225 в филиале 426 АСБ «Беларусбанк» код 199, УНП 500826567 Гродненский филиал РУП «Белтелеком».

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Прием документов на участие в аукционе осуществляется по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Горького, 87 А, каб. 202 с 12.10.2010 по 08.11.2010 включительно в рабочие дни (с 9.00 до 16.00). Документы, поданные после 16.00 08.11.2010 не рассматриваются.

**Телефоны для справок (0152) 43 25 71, 48 65 95, факс (0152) 72 02 07.**

**КПУП «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) извещает о проведении 28 октября 2010 года повторного открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16**

| № лота | Наименование | Характеристика | Начальная цена продажи, с учетом НДС, бел. руб. | Задаток, с учетом НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Воздушное судно НАРП-1 | Сельскохозяйственный, однодвигательный, поршневой двухместный моноплан. Изготовлен 01.09.2004, назначенный ресурс самолета 4000 часов, 10000 посадок, 15 лет. Ремонтов не имел. Двигатель Rotax-912, назначенный ресурс 3600 часов, 45 лет. | 41 256 000 | 4 000 000 |

**Продавец:** Открытое акционерное общество «ГОМЕЛЬХИМСЕРВИС». **Имущество расположено по адресу:** 247050, г. Гомель, ул. Интернациональная, 25. **Шаг аукциона – 5 %.** К участию в аукционе допускаются лица, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе по форме, определенной организатором аукциона, внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, представили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2-18** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения **по 26 октября 2010 г. включительно.** Подача документов по почте не допускается.

В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» № 151 от 05.08.2010.

**Задаток для участия в аукционе перечисляется на расчетный счет продавца (Открытое акционерное общество «ГОМЕЛЬХИМСЕРВИС»): р/с 3012200630018 в Гомельском областном упр. ОАО «Бел.АПБ» УНП 400010620, ОКПО 05884280.**

**Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74 17 34, 74 89 64.**



# Ад здымкаў «на ўспамін» да міжнароднага прызнання

У інстытуце імя Гётэ ў Мінску экспануецца выстава фотамайстра з Германіі Ёрга Айднера. Гэтая выстава прымеркаваная да святкавання 50-гадовага юбілею найстарэйшага фатаграфічнага калектыву краіны — Народнага фотаклуба «Мінск».

Да фотаклуба «Мінск» нямецкі фотамастак мае самае непасрэднае дачыненне. Будучы студэнтам Беларускага політэхнічнага інстытута, Ёрг набыў свой першы фотаапарат маркі «Зеніт», каб рабіць здымкі на ўспамін са сваіх падарожжаў па Савецкім Саюзе. Падчас канікулаў замежныя студэнты мелі цудоўную магчымасць падарожнічаць ва ўсе канцы краіны, чым Ёрг Айднер скарыстаўся напоўніцу за пяць гадоў навучання.

З цягам часу з'явілася жаданне рабіць здымкі больш сур'ёзныя, чым проста «на ўспамін». Пачуў, што ў Мінску існуе фотаклуб, дзе збіраюцца аматары і прафесійныя фатографы. Стаў рэгулярна наведваць «клубныя чацвяргі». Тут Ёрг зразумеў, што такое сапраўднае фотамастацтва, бо клуб ужо на той час меў багатую гісторыю, вопыт і традыцыі ўдзелу ў шматлікіх рэспубліканскіх і міжнародных выставах і арганізацыі ў Мінску падобных выстаў. Асабліва інтэнсіўным было супрацоўніцтва з Міхасём Жылінскім, які хутка зацікавіў Ёрга графічнай апрацоўкай здымкаў. У 1975 годзе ён быў прыняты ў фотаклуб «Мінск», актыўна ўдзельнічаў у яго жыцці. І на працягу многіх гадоў да гэтай пары, жывучы і працуючы ў Германіі, Ёрг захаваў цёплыя адносіны да фотаклуба і сваіх настаўнікаў.



Ёрг Айднер і сёння шмат падарожнічае. Аўтар прымаў удзел у 62 міжнародных выставах, атрымаў дзевяць узнагародаў. Як знак прызнання яго творчасці міжнароднай фатаграфічнай супольнасцю, з 1994 года мае тытул Artist FIAP. Выстава ў інстытуце імя Гётэ ў Мінску — чацвёртая персанальная выстава аўтара.

**Марыя ЖЫЛІНСКАЯ.**
**Фота аўтара.**



# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




## ІНШАЗЕМЦЫ ВЕЗЛІ КАНТРАБАНДНАЕ МЯСА

Ля Дуброўны супрацоўнікі ДАІ спынілі ГАЗ, якім кіраваў жыхар расійскага Таганрога, у салоне таксама знаходзіўся грамадзянін Грузіі. Пры аглядзе машыны вартавыя парадку знайшлі больш за 2,1 тоны мяса буйной рагатай жывёлы. Адпаведныя дакументы на мяса адсутнічалі. Мяса ацанілі на суму больш за 21,7 мільёна рублёў. Былі складзеныя адміністрацыйныя пратаколы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**Сканворд (5 кастрычніка). Па гарызанталі:** Міцкевіч. Раман. Маўр. Біта. Раёк. Рыза. Талакно. Дражэ. Наа. Зад. Колас. Пушкін. Сіп. Макі. Сінап. Фантаст. Тартак. Паралюш. Тын. Уша. Кіл. Сурыкаў. Орган. Сафа. Кліка. Латук. Ара. Анды. Атланта. **Па вертыкалі:** Піяф. Тор. Транш. Унты. Танка. Рэзістар. Інкаса. Ані. Стол. Мора. Пята. Склад. Аўран. Купала. Цемра. Фіта. Ёта. Сакура. Ніка. Акат. Люкс. Рур. Міна. Калчан. Лук. Кацюша. Гняздо. Скіп. Шаўчэнка.

**Сканворд + судоку (7 кастрычніка). Па гарызанталі:** Альфа. Эпіграф. Юнак. Мора. Ушу. Факс. Ранг. Радар. Гасцініца. Лал. Фраза. Альба. Амак. Гід. Кукша. «Яма». Злак. Клан. «Аякс». Акт. Ліра. Мігалка. **Па вертыкалі:** Глог. Слалам. Лінза. Каскадзёр. Фікус. Ілька. Амур. «Набука». Апілак. Яхідна. Пярун. Шык. Граф. Ра. Амяла. Замак. Флікер. Акант. Судоку: адказы гл. у табліцы.

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 6 | 3 | 4 | 5 | 1 | 2 | 8 | 7 | 9 |
| 9 | 8 | 2 | 6 | 7 | 3 | 5 | 4 | 1 |
| 5 | 1 | 7 | 4 | 9 | 8 | 2 | 6 | 3 |
| 4 | 2 | 6 | 1 | 5 | 7 | 3 | 9 | 8 |
| 1 | 9 | 8 | 3 | 2 | 4 | 7 | 5 | 6 |
| 3 | 7 | 5 | 9 | 8 | 6 | 4 | 1 | 2 |
| 2 | 6 | 9 | 8 | 4 | 5 | 1 | 3 | 7 |
| 7 | 5 | 3 | 2 | 6 | 1 | 9 | 8 | 4 |
| 8 | 4 | 1 | 7 | 3 | 9 | 6 | 2 | 5 |

HONORBANK
ОНЕРБАНК
Закрытое акционерное общество

## ЗАО «Онербанк»

220004, г. Минск, ул. К. Цеткин, 51.
Тел./факс 306 25 91.

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2010 г. ЗАО «Онербанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2010 | 01.10.2009 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 458,9 | – |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 6 245,2 | – |
| 4 | Ценные бумаги: | 1103 | 27 222,6 | – |
| | для торговли | 11031 | – | – |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | – | – |
| | в наличии для продажи | 11033 | 27 222,6 | – |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 20 868,9 | – |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 128,7 | – |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | – | – |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 953,1 | – |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 4 154,4 | – |
| 10 | ИТОГО активы | 110 | 60 031,8 | – |
| 11 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | – | – |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 13 993,0 | – |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 105,7 | – |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | – | – |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 765,6 | – |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | 14 864,3 | – |
| 18 | КАПИТАЛ | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 46 710,0 | – |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | – | – |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | – | – |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | (-1 542,5) | – |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | – | – |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | 45 167,5 | – |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 60 031,8 | – |
| 26 | ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 24 607,7 | – |
| 28 | Обязательства | 1302 | 26 176,1 | – |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2010 г. ЗАО «Онербанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2010 | 01.10.2009 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 2 791,7 | - |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 62,9 | - |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 2 728,8 | - |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 5,1 | - |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 90,1 | - |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | (-85,0) | - |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | (-327,1) | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | - | - |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 622,7 | - |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 2 416,1 | - |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 2 316,3 | - |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 3 336,3 | - |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | - | - |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | (-1 542,5) | - |

**Председатель Правления** **М. Талеби Гелин Гешлаги**
**Главный бухгалтер** **Л. И. Кислюк**
**Дата подписания 11 октября 2010 г.**

*Лицензия на осуществление банковских операций, выданная НБ РБ № 32 от 16.10.2009 г.*

# ШАШКІ

*Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА*

### 70-ГОДДЗЕ МАЭСТРА

**Яго нядаўна адзначыў самы славуты ў Беларусі маэстра рускіх шашак Аркадзь Міронавіч Плакхін.**

**Прыродныя аналітычныя здольнасці і творчы падыход да кожнай партыі, амаль беспамылковая гульня дазволілі яму стаць чэмпіёнам краіны, СССР і свету — прычым неаднойчы. За гэтыя найвышэйшыя паказчыкі ён атрымаў ганаровыя званні майстра спорту і гросмайстра СССР, міжнароднага гросмайстра, заслужанага майстра спорту Рэспублікі Беларусь. Вялікі стратэг і тактык часта стварае сапраўдныя шэдэўры на 64-клетачнай дошцы. Таму моладзь ды і вопытныя ігракі ахвотна вывучаюць яго спадчыну.**

**Віншуючы юбіляра, прысвячаем яму канструкцыю 10 на 11. У ёй вядучы рубрыкі спрабуе механізм камбінацыі практычнай гульні ажыццявіць і ў кампазіцыі, да якой ветэран працы і спорту адносіцца з павагай:**





**Белыя**: a3, a5, b2, c3, d4, d6, f2, g1, g3, h6 (10). **Чорныя**: b6, b8, c7, e5, e7, f4, f6, f8, g7, h2, h4 (11). Выйгрыш.

### «ПАГОДА Ў ДОМЕ»-7/24



**Белыя**: b4, d2, f4, g5, h2, h4 (6). **Чорныя**: a3, b2, d4, f8, h6 (5). Ход белых. Які вынік?

На гэтым заканчваем конкурс.

### АЎТАРСКІ-11/10

А конкурс міжнароднага гросмайстра, чэмпіёна свету па шашачнай кампазіцыі Уладзіміра Матуса (Масква) працягваецца яго чарговым заданнем:



№ 10. **Белыя**: 13, 15, 18, 19, 25, 37, 42, 43, 46, 50 (10). **Чорныя**: 4, 9, 17, 30, 33, 34, 36, 39, 40, 45 (10). Перамога белых.

* * *

**Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

### РАШЭННІ

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў.

**«Пагода ў доме»-7** (М. Грушэўскі): **№ 16.** b6, c7, a5, d8, h4x; **№ 17.** g5 (f6) d8 (c7A) b8, g3/h2x. A(f4) c5/e7/f8x; **№ 18.** I cb8 (f6A) b2, a3, g1 (e5/g5) b8x. A(c7) a3, c3, g1x. I ab8?, d8, e1 (g1) h2 (g5) f4 (h4, f2, f2)=; **№ 19.** I g5 (f2A) d8, g1 (a3) c3 (h6) f6x. A(h6) d8, h8 (g3) d4x. I d8? (c7 I I) h8 (f2)=. I I (f2?) g5!, g1x, як у галоўным аўтарскім варыянце; **№ 20.** I b8 (f4) c3, a3, h4 (e3) e1 (d4A) b2x. A(f4) b2 (g3, d2) c3x. I c3?, e1 (a3) f2 (b4) b8 (d4) h2 (bc3) bc7 (d2) d8 (c1, c3) d8 (c1-d2) b6 (c1) a5 (c1-d2) e3 (h6) e1 (b2!, g7)= i **№ 21.** I g5, d6 (b4 ABC) a3!=. C(e3/f2/g1) b4/a3=. B(b2) c1=. A(fe5) f8!=. I d6? (ef6!, c5, f6)x.

**АЎТАРСКІ-11** (У. Матус): **№ 6** — 43, 8, 40, 3, 42, 28, 5x; **№ 7** — 41, 7, 2 (27:38) 8, 24, 24x; **№ 8** — 8, 44-39, 38, 20, 5, 23, 7x i **№ 9** — 38, 41 (47) 27, 19, 34, 3, 8, 5x.

**АЎТАРСКІ-12** (П. Шклудаў): № 9 — f6 (g7a) b6, b4, d8, c7, e3 (f2) e3, e1x. a(e7) g5 (f6) e3, f8x i **№ 10** — праблема: b8, d6, b4, d8(h6 **A**) c3, f4, a5(g5) d2(h4) e1(b6) f2(a5) e1+. **A**(h4) e7(f2) a5(g1 **B**) f8(f6) e3(d4) g3, c5, e1+. **B**(b6) c7(e1) ed8(b4) hg3, f6, a5+, эцюд: 1. gh2+ з трыма кампазіцыйнымі варыянтамі.

**«70-ГОДДЗЕ МАЙСТРА»** (задача прысвечана В. Палянскаму Б. Івановым): hg7 (e1 A) e5, g3, f6#. A (e7) g5, e5, g3#.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.31 | 18.20 | 10.49 |
| Віцебск — | 7.23 | 18.08 | 10.45 |
| Магілёў — | 7.21 | 18.10 | 10.49 |
| Гомель — | 7.16 | 18.09 | 10.53 |
| Гродна — | 7.46 | 18.35 | 10.49 |
| Брэст — | 7.45 | 18.38 | 10.53 |

## Месяц

***Першая квадра 15 кастрычніка. Месяц у сузор'і Стральца.***

## Імяніны

***Пр.** Івана.*

***К.** Вітольда, Максіміляна, Серафіма, Яўстаха.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




# ВЯСЕЛЬНЫЯ ЧЫНЫ

- **Шафер (шаферка)**. Шаферам і шаферкай, сяброўкамі, дружкамі (ганаровымі сведкамі) могуць быць незамужнія, нежанатыя маладыя людзі, у якіх няма дзяцей.
- Шафераў выбіраюць з самых блізкіх сяброў. Такую ганаровую ролю на вяселлі можна выканаць толькі раз у жыцці, каб своечасова стварыць сваю сям'ю. У адваротным выпадку можна нашкодзіць сабе — застацца шаферам (г. зн. адзінокім) назаўжды.
- **Сваты.** У народнай традыцыі кожны бок (жаніха і нявесты) меў сваіх сватоў, прычым дзве пары. Як правіла, сватамі на вяселлі станавіліся хросныя бацькі: хросная маці з мужам і хросны бацька з жонкай. Пры гэтым трэба было ўлічваць, што гэта паўнавартасныя сем'і, у якіх растуць дзеці. Хросны бацька быў самым актыўным удзельнікам падчас сватання, а хросная маці павінна была паклапаціцца пра вясельны каравай свайго хрэсніка.
- Калі ў сем'ях хросных бацькоў быў, што называецца, «непарадак», сватоў выбіралі з ліку сваякоў, сяброў, суседзяў. Патрабаванне заставалася ранейшым — каб гэта была шчаслівая сям'я!
- Сватамі можа быць толькі шлюбная пара. На вяселлі ўсе і ўсё павінна быць па парах. Не варта браць у сваты разведзеных, аўдавелых, бяздзетных або тых, хто да 40 гадоў не стварыў сям'і.
- Часам сватамі бралі тых, хто карыстаўся папулярнасцю ў гэтай мясцовасці. Пару ацэньвалі па колькасці праведзеных вяселляў — чым больш, тым лепш, і па тых водгуках, якія давалі ўдзельнікі гэтых вяселляў.
- Ручнік свату завязваюць праз левае плячо вузлом пад правую руку, а свацці наадварот — праз правае плячо пад левую руку. Адпаведным чынам прымацоўваюць вясельныя кветкі і ганаровым сведкам: хлопцу — справа, дзяўчыне — злева.
- Ніякія ружовыя ці блакітныя стужачкі з надпісамі (як у выпускнікоў школы) не могуць замяніць традыцыйных вясельных ручнікоў!
- **Хросныя бацькі.** Калі хросныя бацькі не выконваюць ролю сватоў, яны становяцца самымі ганаровымі гасцямі на вяселлі, — як і бабулі і дзядулі. Гэтыя людзі з'яўляюцца своеасаблівай ахоўнай «граматай» вясельнай імпрэзы.
- Хросныя бацькі павінны прысутнічаць у храме пры шлюбе.
- Калі па якіх-небудзь прычынах хросныя не могуць прысутнічаць на вяселлі, то напярэдадні жаніху і нявесце варта прыйсці ў храм, паставіць свечкі (за спачын ці за здароўе) і памаліцца за іх.
- **Пасаджоныя бацькі.** Калі адзін з бацькоў жаніха ці нявесты памёр, або калі бацькі развяліся, і народная традыцыя забараняе ім выконваць абрадавыя дзеянні на вяселлі, на іх месца з ліку сваякоў ці блізкіх сяброў выбіраюць пасаджоных бацькоў — шчаслівую сямейную пару, у якой ёсць дзеці. Пасаджоныя бацькі адправяць маладых у вясельную дарогу, сустрэнуць іх пасля рэгістрацыі шлюбу і вянчання перад парогам бацькоўскай хаты.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

Здарэнне

## КУЛЯ ВЫБРАЛА ПЕНСІЯНЕРА

замест дзіка, на якога яны з сябрам палявалі, маючы ўсе неабходныя дакументы, паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама. Падчас палявання каля вёскі Гарнаўка Рэчыцкага раёна 27-гадовы паляўнічы зрабіў стрэл у жывёлу, але, па папярэдняй інфармацыі, куля спачатку трапіла ў дрэва, а потым рыкашэтам — у клуб 55-гадоваму гамяльчаніну. Мужчыне пашанцавала: жыццёва важныя органы не пашкоджаны.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Усміхнемся!

Суседзі.

— Прашу ў вас прабачэння, спадарыня: я даведаўся, што мая курыца пашкодзіла вашы памідоры.

— Не хвалюйцеся, спадар, мой сабака загрыз вашу курыцу.

— А, гэта цудоўна — ваш сабака трапіў пад мой аўтамабіль.

☺

**Сантэхнік Сідараў ужо неаднаразова кадзіраваўся ад алкагалізму. Але па фатальным збегу акалічнасцяў кожны раз код супадаў з кодам яго пад'езда.**

☺

Жонка тэлефануе мужу:

— Можаш гаварыць?

— Так...

— Тады слухай!

☺

**Учора ўвечары быў абрабаваны сэкс-шоп. Па гарачых слядах рабаўнік быў злоўлены і пакараны выкрадзеным.**

☺

— Дарагі, я хачу жыць з табой доўга і шчасліва!

— Дарагая, калі ты будзеш жыць шчасліва — я доўга не працягну...

☺

**Аперацыя «Чыстыя рукі» — пошук мужчыны без заручальнага пярсцёнка.**

☺

— Навошта людзі заводзяць дачу?

— Каб пераканацца, якое прыемнае і добрае жыццё без яе!




ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 4955 Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12